

З ЛІЦЭЯ ВА ЎНІВЕРСІТЭТ – БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ 3

ПАЧАЎСЯ СЕЗОН ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НА АЛЕРГІЮ 6





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 МАЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 92 (29972)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Філіп ГУЛЫ, старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі:**

*«Санкцыі прыпалі ўжо на постпандэмічны перыяд, калі беларуская турындустрыя навучылася выжываць насуперак лагістычным абмежаванням і пры адсутнасці галіновых мер падтрымкі. Таму санкцыі стварылі павышаны попыт, рынак, які расце, натуральную ўзаемную цікавасць да турыстычнага прадукту Беларусі і Расіі. У індустрыі гасціннасці з'явіўся стымул працаваць у анлайн-продажах без глабальных пасрэднікаў»,*

# Шляхі жыцця вядуць у Беларусь



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Генерал-палкоўнік у адстаўцы Мікалай КІЗЮН, якому сёлета споўнілася 95 гадоў, прыехаў у Мінск у майскія дні, у час вялікіх дзяржаўных свят. З Беларуссю ў Мікалая Фадзеевіча, украінца па паходжанні, ураджэнца расійскай Сібіры, звязаныя не толькі гады службы ў нашай ваеннай акрузе. Двойчы ён выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. А яшчэ ў Мінску ў Сувораўскім вучылішчы атрымліваў азы ваеннай навукі, а пасля служыў у Рагачове яго сын Сяргей — сёння таксама генерал-палкоўнік. Звязала сваё жыццё з Беларуссю і дачка Мікалая Фадзеевіча Таццяна ВАРЫВОНЧЫК — яна жыве ў Мінску, доўгі час выкладала ў Сувораўскім вучылішчы. Яе з бацькам і сфатаграфаваў наш карэспандэнт каля легендарнага танка перад Домам афіцэраў.

## КОРАТКА

- **Эксперт прадукцыі «Камунаркі» за першы квартал вырас больш як на 20 працэнтаў.**
- Забарона на наведванне лесу ўведзена ў 65 раёнах Беларусі.
- **Беларускія хакеісты абыгралі расіян у першым дамашнім матчы майскага турнэ.**
- Лазеры і беспілотнікі. НАН Беларусі прадставіць на MILEX-2023 каля 80 распрацовак і тэхналогій.
- **Падатак на прафесійны даход з 1 ліпеня стане абавязковым для рамеснікаў.**



Прафесійны Алімп

## PROFSKILLS BELARUS 2023: НОВЫЯ «ЗОРКІ»



Фота Лізаветы ГОЛАД.

**Клеявы пісталет, шурупавёрт з насадкамі для свідравання і закручвання, кусачкі, абцугі, круглагубцы, свечка, запальнічка, стэплер са скабой, клеявыя стрыжні, секатар, харчовая плёнка... Як вы думаеце, прадстаўнікі якой прафесіі карыстаюцца такім наборам інструментаў? Не марнуйце час у пошуках адказу, таму што усё роўна «трапіце ў малако». Гэта звычайны набор інструментаў для... фларыстаў. Менавіта так: Рэспубліканскі конкурс ProfSkills Belarus 2023 даў адказы на многія пытанні і стаў сапраўдным гідам у свет сучасных прафесій. На два дні Футбольны манеж у сталіцы пераўтварыўся ў магутную прафарыентацыйную пляцоўку, якую наведалі тысячы школьнікаў.**

СТАР. 4

Дзяржаўны інтарэс

## І МАЛАКО, І МЯСА

### Што новага прапануюць у найбліжэйшай будучыні беларускія навукоўцы практыкам-жывёлаводам

**Калі вы думаеце, што жывёлагадоўля — кансерватыўная галіна ведаў, вы адсталі ад жыцця мінімум на некалькі дзесяцігоддзяў. У сучаснай жывёлагадоўлі ёсць задачы для селекцыянераў і спецыялістаў геннай інжынерыі, шырокага спектра прафесіяналаў IT-галіны, прадстаўнікоў найбольш інавацыйных галін ведаў. Над чым сёння працуюць беларускія навукоўцы ў сферы жывёлагадоўлі?**

СТАР. 5



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Навуковы супрацоўнік лабараторыі эмбрыягенезу Вольга ПАЙТЭРАВА.

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «У НАС ЁСЦЬ ДОБРАЯ АСНОВА ДЛЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Уладзімірскай вобласці Аляксандрам Аўдзеевым. Гэтымі днямі Аляксандр Аўдзееў упершыню наведвае Беларусь у якасці кіраўніка рэгіёна. У цэнтры ўвагі — пытанні эканамічнага характару, супрацоўніцтва ў сферах сельскай гаспадаркі, гандлю, будаўніцтва. Гэтыя і іншыя тэмы падчас рабочай сустрэчы абмеркавалі Аляксандр Лукашэнка і Аляксандр Аўдзееў.**



Фота БелТА.

Перш чым пачаць гутарку, кіраўнік дзяржавы павіншаваў гасцей і жыхароў Уладзімірскай вобласці з вялікім і святым святам — Днём Перамогі. «Гэтымі днямі мы якраз святкуем вялікае дасягненне нашага народа. Гэта чарговая гадавіна вялікай Перамогі. Я думаю, мы яе заслужылі і свята будзем берагчы», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што першы візіт Аляксандра Аўдзева ў нашу краіну ў статусе кіраўніка расійскага рэгіёна дазволіць на месцы хутчэй вызначыцца з патрэбамі, знайсці пастаўшчыкоў, а можа, і заключыць новыя кантракты. «Наш урад арыентаваны на тое, каб аказаць вам максімальнае садзейнічанне. Словам, усё, на што мы здольныя, калі гэта вас задавальняе, — мы гатовы ў гэтым кірунку працаваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт расказаў, што ў ходзе кантактаў на найвышэйшым узроўні з яго расійскім калегам Уладзімірам Пуціным яны пастаянна гавораць аб неабходнасці паглыблення інтэграцыі, вытворчай кааперацыі і, самае галоўнае, імпартазамяшчэння. «І, вы ведаеце, у нас нядрэнна атрымліваецца, нават болей, чым мы чакалі. Лічу, у гэтым найперш павінны быць зацікаўлены кіраўнікі рэгіёнаў і прадпрыемстваў. Вы там, на месцы, вы з людзьмі», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, усё, што неабходна было прыняць і падпісаць, кіраўнікамі дзяржаў, урадамі ў асноўным зроблена. «Адкрыта шырокая дарога, каб рэалізаваць тыя задумкі, якія мы меркавалі ў сферы двухбаковага супрацоўніцтва. У 2022 годзе гандаль у нас дасягнуў свайго найвышэйшага ўзроўню з 2017 года і склаў амаль паўмільярда долараў. І ў параўнанні з 2021-м у мінулым годзе павялічыўся амаль на 20 працэнтаў. Па трох месяцах гэтага года таксама адзначаецца станоўчая дынаміка: у параўнанні з аналагічным перыядам 2022 года тавараабарот павялічыўся амаль на трэць. Нам, чаго б гэта ні каштавала, трэба захаваць гэтыя тэмпы. У нас часта бываюць добрыя пад'ёмы, потым адбываюцца спады. Вось гэтых перападаў быць не павінна», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Сёння беларускі бок пастаўляе і мае намер прапаноўваць і далей пастаўляць ва Уладзімірскую вобласць прадукцыю машынабудавання, станкабудавання, дрэваапрацоўкі, хімічнай і лёгкай прамысловасці, аграпрамысловага комплексу. «Ведаю, што ёсць жаданне па плямянной справе. Ёсць жаданне па меліярацыі. У прынцыпе вы робіце і тое, што робім мы. Можа, мы крыху раней пачалі гэта рабіць. Вы на нас можаце раўняцца», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, у Беларусі запатрабавана прадукцыя хімічнай прамысловасці, машынабудавання і станкабудавання, харчавання і шмат іншага, што выпрабляецца ва Уладзімірскай вобласці.

Айчынныя пасажырская, грузавая, сельскагаспадарчая, камунальная, дарожна-будаўнічая тэхніка і ліфтавае абсталяванне адпавядаюць узроўню сусветных стандартаў, іх якасць і надзейнасць праверана шматгадовай эксплуатацыяй, а мадэльны асартымент пастаянна абнаўляецца.

«Спадзяюся, падчас свайго знаходжання ў Беларусі вы з калегамі вызначыцеся, што менавіта з тэхнікі сёння неабходна Уладзімірскай вобласці, а мы ў найкарацейшыя тэрміны паставім вам гэтую тэхніку для таго, каб вам лепей жылося. Уладзімірская вобласць — родная нам вобласць. Яна такая, як Беларусь. Ведаю, што вы не супербагатыя, таксама як і мы, усё дастаецца працай. Людзі аднолькавыя. Таму ў нас ёсць добрая база, добрая аснова для супрацоўніцтва, заўсёды да гэтага гатовыя», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

### «Структура эканомікі Рэспублікі Беларусь і Уладзімірскай вобласці вельмі падобныя»

У сваю чаргу Аляксандр Аўдзееў павіншаваў Аляксандра Лукашэнку з Днём Дзяржаўнага сцяга, герба і гімна, які адзначаўся некалькі дзён таму. «Рэспубліка Беларусь з'яўляецца даўнім надзейным партнёрам Уладзімірскай вобласці. У нас каля 100 краін-партнёраў, і Беларусь займае ў гэтым спісе пятае месца. І я думаю, што гэта стартавая пазіцыя, якую трэба павышаць. І паляпшаць нашы пазіцыі ў таварабароце, у абмене культурнымі і турыстычнымі паслугамі і гэтак далей. У нас працуе больш за 30 прадпрыемстваў, заснавальнікамі якіх з'яўляюцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь. У цэлым структура эканомікі Рэспублікі Беларусь і Уладзімірскай вобласці вельмі падобная па сельскай гаспадарцы, па прамысловасці, таму магчымасці кааперацыі досыць высокія», — расказаў губернатар.

Беларусь пастаўляе ва Уладзімірскую вобласць абсталяванне, сыравіну для вытворчасці. Канчатковы прадукт — вырабы са шкла, пуцявое абсталяванне, розныя інструменты, вымяральна-кантрольныя, медыцынскія прыборы, вырабы з пластмасы. Асобны радок займаюць грамадскі транспарт, сельскагаспадарчая і камунальная тэхніка. Як расказаў Аляксандр Аўдзееў, рухавікі беларускай вытворчасці дазволілі Уладзімірскай вобласці ўвайсці ў лік рэгіёнаў, дзе выпускаюцца трактары-пагрузчыкі пад уласным брэндам. «Добры прыклад кааперацыі — з кампаніяй Askona, якая выпускае тавары для сну. Для вырабаў гэтай кампаніі 12 прадпрыемстваў выпускаюць камплектуючыя», — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва Беларусі з Уладзімірскай вобласцю Расіі характарызуецца дадатнай дынамікай. За 2022 год аб'ём тавараабароту склаў амаль 414 мільёнаў долараў. Гэта на 20 працэнтаў больш за паказчык 2021-га і найбольшы аб'ём за перыяд з 2017 года. У студзені — сакавіку гэтага года тэндэнцыя да росту ўзаемнага гандлю захоўваецца: 93,4 мільёна, што на 32 працэнты перасягае ўзровень за аналагічны перыяд 2022 года.

Беларускі экспарт ва Уладзімірскую вобласць за мінулы год склаў 130 мільёнаў і павялічыўся за год больш як на 46 працэнтаў. У яго аснове — прылады на вадкіх крышталах, лазеры, часткі рухомага саставу, смолы і поліэрэтаны, шкловалакно і вырабы з яго, ніткавыя матэрыялы. Імпартуюцца ў Беларусь з гэтага расійскага рэгіёна медны дрот, часткі рухомага саставу, шакалад і гатовыя харчовыя прадукты з какавы, спецыфічныя тавары, кандытарскія вырабы з цукру.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

### «Мы будзем старацца ўзяць планку ў паўмільярда»

У размове з журналістамі Аляксандр Аўдзееў падкрэсліў, што ў Беларусі і Уладзімірскай вобласці ёсць пункты судакранання, у якіх кааперацыя і інтэграцыя вытворчага працэсу паміж прадпрыемствамі выгадная і абсалютна бязболыная. «Калі мы глядзім на ўнутраную кааперацыю прадпрыемства, аказваецца, мы можам імпарт замясціць не толькі ў самой прадукцыі, але і ў кампетэнцыях, тэхналогіях. Наша прадпрыемства пастаўляе Беларусі пяцікаардынатныя апрацоўчыя станкі, і яны актыўна выкарыстоўваюцца. Мы абмяркоўвалі пытанні канструктыўнага і практычнага супрацоўніцтва ў сферы сельскай гаспадаркі, будаўніцтва, пастаўкі грамадскага транспарту, сельгастэхнікі.

Наш візіт скончыцца падпісаннем канкрэтных пагадненняў і павелічэннем узаемнага тавараабароту. 2022 год стаў рэкордным па тавараабароце паміж вобласцю і рэспублікай. Упэўнены, што гэта далёка не мяжа. Мы будзем старацца ўзяць планку ў паўмільярда. На гэты год мы плануем закупіць камунальную тэхніку, грамадскі транспарт і выйсці на пастаўку камплектуючых для гутаў і іншых заводаў», — расказаў ён.

Таксама губернатар Уладзімірскай вобласці падкрэсліў, што рэгіёну варта павучыцца ў Беларусі ў кіраванні гарадской камунальнай гаспадаркай. «Тое, у якім парадку знаходзіцца вытворчая сфера, як выбудаваны дзелавыя адносіны, — вельмі важны вопыт, які будуць пераймаць нашы прамысловцы і прадпрыемствы, дзякуючы падпісанаму пагадненню з гандлёва-прамысловай палатай Рэспублікі Беларусь. Гэты досвед пойдзе нам на карысць», — адзначыў ён.

У панядзелак адбылося пасяджэнне Рабочай групы па супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь і Уладзімірскай вобласці Расійскай Федэрацыі. У гэты ж дзень прайшлі перагаворы старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і кіраўніцтва Беларускай гандлёва-прамысловай палаты з Аляксандрам Аўдзеевым. У графік візіту губернатара ўключаны перагаворы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам. Госці таксама наведалі ААТ «МТЗ», ААТ «МАЗ», ААТ «Белкамунмаш», ААТ «Амкадор», Парк высокіх тэхналогій, Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень», а таксама Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

# РАБОТУ НЕАБХОДНА АКТУАЛІЗАВАЦЬ

## У Беларусі выпрацуюць рэкамендацыі па правядзенні адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы гістарычнай памяці

**Аб гэтым заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА на пасяджэнні Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы.**

Ігар Сергеенка расказаў, што пасля Паслання Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту складзены пратакол даручэнняў кіраўніка дзяржавы. Адно з іх датычыцца работы савета. «На рэалізацыю гэтага даручэння павінна быць накіравана работа нашага савета ў гэтым годзе: «Рэспубліканскаму савету па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь выпрацаваць рэкамендацыі па правядзенні адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы гістарычнай памяці і арганізацыі работы па ўмацаванні нацыянальнай самасвядомасці, заснаванай на навуковых падыходах і прынцыпах гісторыі беларускай дзяржаўнасці», — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Паводле слоў Ігара Сергеенкі, мерапрыемствы, якія праводзяцца саветам у мінулым і бягучым годзе, сталі складнікамі працы рэалізацыі гэтай задачы. Але работу, падкрэсліў ён, неабходна актуалізаваць і, магчыма, напоўніць новым зместам.

**Міністр культуры Анатоль МАРКЕВІЧ** на пасяджэнні савета агучыў некалькі прапаноў, якія, паводле яго слоў, будзе важна рэалізаваць для больш комплекснага і маштабнага ўвасаблення Канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці ў рабоце ўстаноў культуры. Напрыклад, сфарміраваць электронную базу даных «Пантэон нацыянальных герояў». «Яна магла б служыць асновай для распрацоўкі сюжэтаў твораў мастацтва», — растлумачыў Анатоль Маркевіч.

Міністэрства культуры таксама прапаноўвае знайсці месца для ўзвядзення новага будынка Нацыянальнага гістарычнага музея. Гэта дасць магчымасць сфарміраваць цэласную экспазіцыю аб усіх перыядах беларускай гісторыі, адзначыў міністр.

Акрамя таго, Анатоль Маркевіч лічыць важным разгледзець пытанне аб заснаванні Дня партызан і падпольшчыкаў. Гэта свята, прапанаваў ён, можна прымеркаваць да 9 верасня — менавіта ў гэты дзень у 1942 годзе былі створаны Беларускі штаб партызанскага руху.

**БелТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Уладзіміру Яўгенавічу Кухараву, старшыні Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Абітурыент-2023

# З ЛІЦЭЯ ВА ЎНІВЕРСІТЭТ — БЕЗ ЭКЗАМЕНАЎ

## Новая траекторыя стварае пераемнасць паміж агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыяй

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ — самы малады доктар хімічных навук у нашай краіне: гэтую вучоную ступень ён атрымаў, калі яму было 33 гады. А ў 35 стаў галоўным вучоным сакратаром Нацыянальнай акадэміі навук, потым быў абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі. На момант прызначэння на пасаду міністра адукацыі Андрэю Іванцу было ўсяго 37 гадоў. Многіх, безумоўна, цікавіць, а якую ж адукацыю атрымаў цяперашні кіраўнік ведамства?**

— Калі ў мяне пра гэта пытаюцца, з гонарам кажу, што я — выпускнік хімічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і профільнага хімічнага класа Ліцэя БДУ, — расказаў Андрэй Іванец цяперашнім ліцэістам падчас сустрэчы ў рамках Фестывалю факультэтаў, арганізаванага ў БДУ. — З часоў маёй вучобы ў ліцэі прайшло ўжо больш за дваццаць гадоў. Гэта былі крыху іншыя часы, мы не сустракаліся ні з кіраўніцтвам універсітэта, ні тым больш з міністрам адукацыі, у нас не было фестывалю факультэтаў, і ўмовы, у якіх мы вучыліся, не ідуць ні ў якое параўнанне з тым, што маеце сёння вы. Напрыклад, на стадыён мы хадзілі ў суседнюю школу, бо свайго не было. Але ў нас панаваў асаблівы ліцэйскі дух, мы адчувалі сябе часткай адной вялікай каманды. І калі я заканчваў вучобу, у нас ніхто не пытаўся, дзе мы хацелі б навучацца, таму што адказ быў відавочны: кожны з маіх аднакласнікаў марыў паступіць у БДУ. Выбар на карысць любой іншай ВНУ разглядаўся як нешта надзвычайнае. І толькі адзін чалавек з нашага класа пайшоў навучацца не ў Белдзяржуніверсітэт, а ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт. І адбылося гэта толькі таму, што яму не хапіла ўпэўненасці ў сваіх сілах пры паступленні. Але і ў яго кар'ера склалася паспяхова. Сёння ён ужо кандыдат навук, узначальвае ў БДТУ навуковую лабараторыю.



У мяне як міністра таксама часта пытаюцца аб прызнанні ці непрызнанні нашых дыпломаў за мяжой. Скажу так: я не бачыў ніводнага вучонага з нашай краіны, які прыехаў бы працаваць за мяжу ў навуковы цэнтр і ў якога папрасілі б паказаць дыплом або яго пацвердзіць. Таму што калі з Беларусі прыязджае вучоны, гэта значыць, што ў яго найвышэйшы ўзровень падрыхтоўкі і прафесіяналізму.

Сустрэча ліцэістаў з міністрам адукацыі і рэктарам БДУ была арганізавана, каб пазнаёміць патэнцыяльных абітурыентаў з новымі магчымасцямі, якія адкрыліся для іх сёлета. Так, выпускнікі трох устаноў адукацыі (Ліцэя БДУ, Ліцэя Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта і Ліцэя Беларуска-Расійскага ўніверсітэта) змогуць стаць студэнтамі гэтых ВНУ без здачы экзаменаў. Такая прывілея распаўсюджваецца на тых, хто мае ў дакументе аб адукацыі адзнакі не ніжэй за «9» балаў па вучэбных прадметах, што адпавядаюць прадметам профільных іспытаў, і адзнакі не ніжэй за «8» балаў па ўсіх астатніх вучэбных прадметах.

Між іншым, дадзеным крытэрыям адпавядае больш за 70 працэнтаў выпускнікоў Ліцэя БДУ бягучага года — 195 чалавек з 252. На думку **дырэктара навучальнай установы Ганны ЧУБАРАВАЙ,** магчымасць стаць студэнтамі Белдзяржуніверсітэта без праходжання дадатковых выпрабаванняў, якая з'явілася ў паспяховых ліцэістаў, — надзвычай важная. Яна стварае пераемнасць паміж агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыяй. Унікальнасць гэтай магчымасці заключаецца ў тым, што ліцэісты ўжо з 10-га класа займаюцца па напрамках тых спецыяльнасцяў, якія яны абралі (гаворка ідзе аб прафілізацыі). У ліцэі з імі працуюць выкладчыкі той жа ўстановы вышэйшай адукацыі, у якую яны пойдуць вучыцца пасля заканчэння ліцэя. Гэта матываваныя дзеці, у якіх зацікаўленыя ў ВНУ.

У папярэднія гады працэнт выпускнікоў Ліцэя БДУ, якія паступалі менавіта ў свой універсітэт, вагаўся ад 40-50 да 70-80 працэнтаў. Выпускнікі біялагічнага профілю часта нацэленыя на атрыманне вышэйшай медыцынскай адукацыі і паступаюць у медыцынскія ўніверсітэты краіны. І гэта нармальна...

Але вось, напрыклад, навучэнка 11-га класа біялагічнага профілю Ліцэя БДУ Паліна Жабінская плануе паступаць без экзаменаў сёлета на біяфак на спецыяльнасць «біятэхналогіі». «У мяне сярэдні бал атэстата — 9,5. Я лічу, што ліцэісты заслугоўваюць права без іспытаў паступаць у БДУ, бо мы ўклалі вельмі шмат сіл у тое, каб паступіць у ліцэй, і на вучобу тут. Таму, лічу, усё справядліва», — разважае дзяўчына.

Выпускнік 11-га класа фізічнага профілю Ліцэя БДУ Арсеній Канапелька прызнаўся, што калі паступаў у ліцэй, думаў над тым, у які ўніверсітэт пойдзе вучыцца далей. Разглядаў розныя варыянты. Але цяпер, калі з'явілася магчымасць паступаць без экзаменаў у БДУ, ён абавязкова ёю скарыстаецца і пойдзе вучыцца на фізічны факультэт. «У мяне сярэдні бал 9,8. Але ўсё роўна новая траекторыя значна спрашчае маё паступленне і зніжае напружанне і хваляванне. Мы ўжо ведаем, што для нас дакладна ёсць месца на першым курсе», — падкрэсліў малады чалавек.

Яго аднакласніца Маргарыта Кітаева таксама будзе паступаць па льготнай траекторыі, але дзяўчына стаіць перад выбарам: пайсці на фізічны факультэт або на факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. «Дадзеная нам магчымасць паступаць у БДУ без іспытаў — вельмі зручны варыянт. Але я, як заўсёды, падстрахуюся і буду здаваць ЦТ на ўсялякі выпадак, а далей буду глядзець і выбіраць», — падзялілася сваімі планамі дзяўчына.

— Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт — найстарэйшы класічны ўніверсітэт у нашай краіне, які складае аснову дзяржаўнай ідэнтычнасці беларускага народа. У яго больш чым стогадовую гісторыю ўпісана шмат імёнаў славутых вучоных, заснавальнікаў навуковых школ, даследчыкаў беларускай культуры. Былі розныя часы, рознае адчуванне часу, але каштоўнасці застаюцца нязменнымі. Ліцэй БДУ — гэта частка вялікай карпарацыі, і вам пашанцавала апынуцца ўнутры адной вялікай сям'і. Вельмі каштоўна быць членам унікальнай супольнасці, — звярнуўся да ліцэістаў **рэктар універсітэта Андрэй КАРОЛЬ.** — Жыццё вельмі імкліва цячэ, паскарэнне адбываецца літаральна ва ўсім, што нас акружае. І ўсё больш складана спыніцца і задаць сабе крытычныя пытанні: а што мне трэба ў жыцці, а для чаго я тут? Усё больш складана размаўляць з самім сабой.

Я глыбока перакананы, што ваша навучанне ў ліцэі не выпадковасць. І на парозе вызначэння далейшага свайго жыццёвага шляху адкажыце сабе сумленна на пытанні, што трэба мне тут, цяпер і ў будучыні. Я не вельмі люблю разважанні пра поспех. Упэўнены, што ў кожнага ў гэтай аўдыторыі ёсць сваё яго бачанне. Хачу пажадаць усім ліцэістам рэалізаваць сваю жыццёвую місію і пражыць жыццё як лёс. Зрабіце правільны выбар і адкажыце правільна на сваё пытанне, таму што ад гэтага будзе залежаць ваша будучыня і ваш поспех.

Андрэй Кароль адзначыў, што новая льготная траекторыя паступлення ў ВНУ для ліцэістаў — гэта выдатная магчымасць, якая дазваляе працаваць з матываванымі абітурыентамі для таго, каб ва ўніверсітэце вучыліся перш за ўсё тыя, хто хоча гэтага, звёўшы да мінімуму колькасць тых, хто зрабіў свой выбар неўсвядомлена, напрыклад, па парадзе бацькоў. Вынік пілотнага праекта, які датычыцца асаблівых умоў для паступлення навучэнцаў трох універсітэцкіх ліцэяў у адпаведныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, мы ўбачым праз некаторы час. Але рэктар БДУ вельмі аптымістычна настроены ў гэтым плане...



«Будзьце ўпэўненыя, што, выбраўшы шлях навучання ў Белдзяржуніверсітэце, вы не памыліцеся. Удачы, поспехаў і беражыце той багаж ведаў, які ў вас ёсць, для таго каб яго раскрыць па-сапраўднаму на карысць не толькі сабе, але і нашай краіне. Дзяржава стварае для вас усе магчымасці», — падсумаваў Андрэй Іванец.

Завяршэннем афіцыйнай часткі мерапрыемства стала ўручэнне ліцэістам іменных запрашэнняў да паступлення ў БДУ. Іх перадалі класным кіраўнікам. Далей на пляцоўцы Фестывалю факультэтаў ліцэісты змаглі задаць усе пытанні аб навоўвядзеннях уступнай кампаніі, пазнаёміцца з унікальнымі спецыяльнасцямі, даведацца аб умовах, створаных у ВНУ для занятку навукай, спортам і культурнай дзейнасцю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара і прэс-службы БДУ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Краіны G7 абмяркуюць рост уплыву БРІКС як «восі супрацьву» Захаду




Дзяржавы — члены G7 падчас саміту ў Японіі, які мае адбыцца, абмяркуюць пытанні, звязаныя з ростам уплыву краін БРІКС (Бразілія, Расія, Індыя, Кітай і Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка) як «восі супрацьўлення» панаванню Захаду. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле японскага выдання Sankei, паведаміла ТАСС. Выданне адзначае, што «пяцёрка» БРІКС прэтэндуе на статус цэнтра прыцягнення для краін Глабальнага Поўдня. Так, у апошні час узрасла колькасць дзяржаў, якія жадаюць далучыцца да БРІКС. Паводле апошніх звестак, як мінімум 19 краін разглядаюць магчымасць уступлення ў БРІКС. Сярод іх — Саудаўская Аравія, Іран, Алжыр, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Аргенціна, Інданезія і Егіпет. Акрамя гэтага, краіны БРІКС могуць у перспектыве стварыць агульную валюту, якая дазволіць адмовіцца ад выкарыстання амерыканскага долара ва ўзаемаразліках. Sankei адзначае, што пытанне стварэння такой валюты плануецца разгледзець на саміце БРІКС, які пройдзе летам у ПАР. Ва ўмацаванні сувязяў з Глабальным Поўднем зацікаўлены не толькі БРІКС, але і краіны G7. З гэтай мэтай, у прыватнасці, на саміт у Японіі былі запрошаны лідары Бразіліі і Індыі, заключае Sankei.

### Маск: Сорас ненавідзіць чалавецтва, а яго фонды створаны не на карысць

Амерыканскі трэйдар і фінансіст Джордж Сорас адчувае нянавісць да ўсяго чалавецтва. Пра гэта ў сваім акаўнце ў Twitter напісаў амерыканскі бізнесмен і вынаходнік Ілан Маск, паведаміла РІА «Навіны». На яго думку, Сорас мае намер «разбурыць саму тканіну цывілізацыі». Пры гэтым Маск адзначыў, што шматлікія фонды Сораса былі створаны не з добрымі мэтамі. Мільярдэр вядомы сваімі фондамі «Адкрытае грамадства», дзейнасць якіх не раз падвяргалася рэзкай крытыцы ў шэрагу краін. Так, Сораса абвінавачвалі ў арганізацыі «каляровых рэвалюцый». Паведамлялася, што ён фінансаваў апазіцыйныя структуры ў многіх дзяржавах, у тым ліку ў перыяд Майдана ва Украіне.

### У Бразіліі адкрыўся маўзалей Пеле

Маўзалей, які пабудаваны для залатой труны Пеле, адкрыты для наведвання балельшчыкамі ў бразільскім горадзе Сантуш, недалёка ад Сан-Паўлу. Тут устаноўлены статуі легенды футбола ў натуральную велічыню, падлога пакрыта штучным газонам. Як растлумачыў адзін з яго сыноў — Эдзіньё, у гэтым месцы ўзноўлена атмасфера стадыёна, як быццам Пеле ўсё яшчэ гуляе, паведаміў Euronews. Ідэя маўзалея прыйшла ў галаву ўладальніку найбуйнейшых у свеце вертыкальных могілак Пепе Алстуту, памерламу ў 2018 годзе блізкаму сябру вялікага футбаліста. Алстут спадзяваўся, што маўзалей будзе знаходзіцца на дзявятым паверсе яго збудавання, з відам на стадыён «Віла Белміра» клуба «Сантуш», дзе Пеле выступаў на працягу 18 гадоў. Замест гэтага сям'я пахавала футбаліста на другім паверсе, каб фанаты маглі мець да яго доступ. Каб наведаць «Мемарыял Караля» з панядзелка да пятніцы, ахвотныя павінны забраніраваць час на сайце мемарыяльных могілак. Як вядома, Пеле прывёў Бразілію да чэмпіёнскага тытула на Кубках свету ў 1958-м, 1962-м і 1970-м гадах. Ён адзіны гулец, які выйграў яго тройчы.

# PROFSKILLS BELARUS 2023: НОВЫЯ «ЗОРКІ»



## «Можна любавацца, рукамі не чапаць...»

— У 2014 годзе мы перафарматавалі нашы конкурсы прафесійнага майстэрства з улікам міжнароднага вопыту і найлепшых сусветных практык. Час паказаў, што конкурс прыносіць карысць па шэрагу напрамкаў. Самае галоўнае — у яго вельмі магутны прафарыентацыйны складнік, — падкрэслівае **рэктар Рэспубліканскагага інстытута прафесійнай адукацыі Валерый ГАЛУБОЎСКІ.** — Конкурс пастаянна прырастае новымі кампетэнцыямі, і ў адным месцы ўсім ужо становіцца цесна. Таму ў гэтым годзе мы выкарысталі размеркаваны фармат: 42 кампетэнцыі прадстаўлены ў Футбольным манежы, а сем — на іншых пляцоўках. Так, напрыклад, спаборніцтвы ў кампетэнцыі «Інфармацыйныя кабельныя сеткі» праходзяць на базе Беларускай акадэміі сувязі, кампетэнцыя «Кузаўны рамонт» — у філіяле РІПА «Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж». На базе цэнтра кампетэнцый Гомельскага дзяржаўнага аўтамеханічнага каледжа, у якім мы нядаўна адкрылі новую лабараторыю, аснашчаную сучасным абсталяваннем, спаборнічаюць канкурсанты па кампетэнцыях «Такарныя работы» і «Фрэзерныя работы». А Слуцкі дзяржаўны каледж прымае кампетэнцыі «Кулінарнае мастацтва», «Рэстаранны сэрвіс» і «Хлебапячэнне».

«Можна любавацца, рукамі не чапаць. Адцягваць увагу ўдзельніка забаронена» — такія фразы на імправізаваных «шыльдах»



сустракалі гасцей на конкурснай пляцоўцы, дзе стварылі сапраўдную прыгажосць фларысты. У 2018 годзе гэта кампетэнцыя была на трэцім рэспубліканскім чэмпіянаце прафесійнага майстэрства дэбютантам. І тады канкурсантаў — а гэта могуць быць толькі маладыя людзі ва ўзросце да 22 гадоў — збіралі літаральна па «крупінках» па ўсёй краіне. Прафесійная фларыстыка была даволі маладой сферай. У дзяржаўных установах адукацыі фларыстаў не рыхтавалі. Гэтым займаліся пераважна прыватныя школы і курсы або практыкавалася індывідуальнае навучанне. Але, нарэшце, у бягучым годзе ў Мінскім дзяржаўным каледжы рамесніцтва і дызайну імя М. Кедышкі распачнецца падрыхтоўка фларыстаў. Набіраць на гэты кірунак будуць як на ўзровень прафесійна-тэхнічнай, так і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Асноўныя арганізацыі — заказчыкі кадраў — Мінскі парнікова-цяплічны камбінат, Галоўнае гаспадарчае ўпраўленне Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і «Ружа.Бел».

## Хлопцы ў фларыстыцы — нарасхват

— Нацыянальны чэмпіянат для нас — гэта яшчэ і магчымасць папулярызаваць фларыстыку сярод моладзі, — падкрэслівае **галоўны эксперт у кампетэнцыі, кіраўнік Мінскай школы фларыстыкі Раман ФЕДАРОВІЧ.** — На гэту прафесію зараз вялікі попыт, паўсюдна патрабуюцца кампетэнтныя спецыялісты. Фларыст — гэта «гісторыя» не толькі пра звычайны букет у прыгожай упакоўцы, які мы бачым у краме. Сёння запатрабаванае дэкаратыўнае кветкавае афармленне розных памяшканняў, сацыяльных і культурных мерапрыемстваў, прэзентацый, вяселляў, фармальных і нефармальных сустрэч.

Але хоць фларыстыка і лічыцца творчасцю, гэта яшчэ цяжкая фізічная праца: кветкі захоўваюцца ў халадзільніку, а гэта пастаянны холад, плюс тэхніку трэба мыць, могуць быць праблемы з запясцямі і скурай... Дзяўчаты не пырхаюць як матылькі вакол кветак, як можна падумаць, а цягаюць іх на сабе. Фларыстыка — гэта рамяство, якое патрабуе ведання раслін, батанічных і небатанічных матэрыялаў і аксесуараў, прынцыпаў і элементаў дызайну кампазіцыі, мастацкіх ведаў, колеразнаўства. Аднаго толькі валодання тэхнікай складання букета фларысту недастаткова. Для спецыяліста вельмі важныя навыкі работы з кліентам, якому ён можа даць экспертную параду, таксама важнае ўменне працаваць у вялікай камандзе на маштабных праектах. Каб стаць эксклюзіўным майстрам, трэба мець густ, уласныя ідэі, увесь час удасканальвацца, у кожную сваю работу ўкладваць не толькі прафесійныя навыкі, але і сэрца і душу.

Падчас конкурсу было прадугледжана шэсць заданняў. Згодна з умовамі спаборніцтваў, усім канкурсантам былі прапанаваныя аднолькавыя расліны, інструменты, расходныя матэрыялы, спецыяльныя каркасы і прыстасаванні. Толькі вынікі атрымаліся ва ўсіх розныя. На конкурсе можна было пабачыць сапраўдныя аўтарскія работы.

— Было б занадта проста, калі б мы далі заданне канкурсантам проста зрабіць вясельны букет, — усміхаецца Раман Федаровіч. — Ім трэба стварыць аксесуар у выглядзе букета-кроплі на порт-ручцы з абавязковым выкарыстаннем гірляндная тэхнікі. Такі букет выглядае цікава і незвычайна. Таксама канкурсанты працуюць над крэатыўным букетам, кампазіцыяй з інтэграцыяй гаршковых раслін і гэтак далей.

Цікавімся, чаму сярод канкурсантаў толькі дзяўчаты.

— У нашай краіне так склалася, што ва ўяўленні многіх фларыст — жаночая прафесія. Хоць у Еўропе і Азіі мужчыны дамінуюць у гэтай прафесіі, — канстатуе Раман Федаровіч. — У міжнародных конкурсах таксама пераважаюць менавіта прадстаўнікі моцнай паловы чалавецтва. У нашай школе сярод навучэнцаў на дзесяць дзяўчат прыпадае толькі адзін хлопец. Заўважу, што мужчыны ў нашай прафесіі цэняцца вельмі высока. Яны яшчэ не паспяваюць завяршыць навучанне, як іх запрашаюць на працу. Таму, калі хтосьці з хлопцаў сумняваецца ў сваім выбары ці саромеецца яго, не сумнявайцеся — смела прыходзьце ў фларыстычны дызайн.

## Будаўнічыя нюансы

Яшчэ адна кампетэнцыя, якая спачатку з'явілася на рэспубліканскім чэмпіянаце рабочых прафесій, а толькі потым у навучальных установах краіны — «Сухое будаўніцтва».

— Яна прысутнічае на конкурсе з 2014 года. І паралельна з правядзеннем конкурсаў адбывалася «легітымізацыя» прафесіі мантажнік каркасна-абшыўных канструкцый. Такія работы на будаўнічых аб'ектах раней выконвалі цесляры, тынкоўшчыкі, сантэхнікі, а спецыялізацыі не было, — тлумачыць **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Сухое будаўніцтва, тынкавачныя работы» Аляксандр ІЎЧАНКА.** — Удзел у конкурсе, вялікая колькасць зваротаў аб неабходнасці ўвядзення гэтай прафесіі прынеслі свой плён. І ў 2018 годзе ў першых трох навучальных установах краіны з'явілася новая спецыяльнасць. У бягучым навучальным годзе такіх устаноў ужо шэсць. Мы — яскравы прыклад супрацоўніцтва бізнесу (як заказчыкаў кадраў) і сістэмы адукацыі. Чэмпіянат спрыяў папулярызацыі новай прафесіі.

Між іншым, сухое будаўніцтва не стаіць на месцы. Пашыраецца рэнавацыя жылля. Можна прыгадаць фільм «Дзяўчаты», у якім галоўная гераіня пералічвае, колькі страў можна прыгатаваць са звычайнай бульбы. Дык вось і мы можам расказваць бясконца пра ўсе нашы нюансы. Большая частка сучасных унутраных работ выконваецца з выкарыстаннем гіпсакардонных сістэм, якія маюць на ўвазе стварэнне металічных каркасаў (яны могуць быць вельмі складаныя, з адтулінамі для дзвярэй і вокнаў) і ўстаноўку гіпсакардону. Гіпсакардон можа быць самых розных відаў: устойлівы да вільгаці, вогнетрывалы, ударатрывалы, устойлівы да вільгаці і да высокіх тэмператур адначасова, гукаізаляцыйны, рэнтгенааховны і гэтак далей. Усё залежыць ад мэт памяшканняў, у якіх гэты матэрыял выкарыстоўваецца.



У нашых канкурсантаў было чатыры заданні. Першы модуль — тэарэтычны — навінка гэтага чэмпіянату. Хлопцам трэба было адказаць на 50 пытанняў у выглядзе тэста па сухім будаўніцтве і тынкавачных работах. Другі модуль — зборка канструкцыі з выкарыстаннем ліставых матэрыялаў і металічных профіляў. Трэці — тынкавачныя работы з дапамогай арміравальных стужак. І апошні модуль — устаноўка дэкаратыўных элементаў (гіпсавых молдынгаў).

Сапраўдны найвышэйшы пілатаж у сваёй прафесіі трэба было праявіць канкурсантам у кампетэнцыі «Цагляная кладка».

— Конкурснае заданне ўяўляе сабой канструкцыю з керамічнай двухколернай цэглы з графічнай канфігурацыяй акружнасцяў, — тлумачыць **галоўны эксперт Уладзімір ДУДАРАЎ.** — Модуль складаецца з трох акружнасцяў, у цэнтры знаходзіцца арнамент у выглядзе валошкі. Акружнасці — гэта найскладанейшы элемент дэкаратыўнай кладкі. Прычым адзін з кругоў выкладаецца парэбрыкам, гэта значыць, што цэгла выкладаецца пад вуглом да паверхні сцяны. Каб выканаць конкурснае заданне, трэба было спачатку ўсё расчарціць, а для гэтага патрабуецца веданне чарчэння і начартальнай геаметрыі, трэба валодаць фігурнай рэзкай на станку, тэхналогіямі выканання элементаў дэкаратыўнай кладкі, якая ўключае геаметрычныя формы, лічбавыя знакі і надпісы з літар. Канкурсанты выконваюць складаныя элементы ўжо шостага разраду, хоць на выхадзе з установы адукацыі звычайна прысвойваецца трэці ці чацвёрты разрад. Мы будзем потым правяраць усе градусы электронным прыборам, бо ўсе элементы павінны выконвацца з дакладнасцю аж да міліметра. Поўны час выканання задання —13 гадзін.

## «Доктар» для вашага аўто

Усе, у каго ёсць аўтамабіль, ведаюць, што знайсці «свайго» аўтамеханіка не менш важна і складана, чым знайсці «свайго» стаматолага або цырульніка. Невыпадкова побач з конкурснай пляцоўкай кампетэнцыі «Аўтамабільныя тэхналогіі» ўвесь час было шматлюдна. Усім цікава, ці «рэанімуюць» аўтамабіль канкурсанты?

— Калі аўтаслесар выконвае выключна механічную работу, рамонт механічнай часткі аўтамабіля, то аўтамеханік — яшчэ і кантрольна-дыягнастычную, ён ведае і электрыку. Аўтамеханік — гэта рабочы з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, — тлумачыць **галоўны эксперт у гэтай кампетэнцыі Алег ЦАРУК.** — Хлопцы, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны ўмець устанавіць няспраўнасці ў электрычнай частцы аўтамабіля (няспраўнасці ўнесены ў сістэму пуску і ў сістэму кіравання рухавіка). Два модулі прысвечаны электраабсталяванню аўтамабіля: на адным няспраўнасці ўнесены ў сістэмы асвятлення (унутранага і вонкавага), а таксама ў сістэму гукавой і светлавой сігналізацыі. На другім аўтамабілі няспраўнасці закладзены ў сістэме камфорту, шклопад'ёмнік і цэнтральнага замка. Асобны модуль — электрамабіль, які не запускаецца, трэба знайсці няспраўнасці і ўстараніць. Яшчэ два модулі прысвечаны механічнай частцы: гэта разборка і зборка рухавіка і яго дэфектоўка з запаўненнем пратаколаў вымярэнняў. На выкананне кожнага модуля даецца 90 хвілін. Галоўным партнёрам выступіла прадпрыемства «БелДЖЫ», якое прадставіла нам свае аўтамабілі.

У рамках V Рэспубліканскага конкурсу былі таксама арганізаваны конкурсныя мерапрыемствы для асоб з абмежаванымі магчымасцямі здароўя па сямі кампетэнцыях Inclusion Skills: «Тэхналогія моды», «Вэб-дызайн і распрацоўка», «Графічны дызайн», «Сістэмнае адміністраванне», «Малярныя і дэкаратыўныя работы», «Агароднінавод», «Рабочы зялёнага будаўніцтва». Беларускай сістэмай адукацыі ўзяты курс на інклюзію, і кола прафесій для гэтай катэгорыі навучэнцаў працягвае пашырацца. Для хлопцаў і дзяўчат, якія ўдзельнічалі ў конкурсе, гэта быў бясцэнны досвед і магчымасць даказаць, што яны ні ў чым не саступаюць сваім равеснікам «без асаблівасцяў».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# І МАЛАКО, І МЯСА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## АБ БЕЛГАЛШТЫНЕ І «ЧЫРВОНЫХ БЕЛАРУСКІХ КАРОВАХ»

Падчас наведвання Гомельскай вобласці кіраўнік дзяржавы ўзняў пытанне аб укамплектаванасці новых і мадэрнізаваных МТК высокапрадукцыйнай буйной рагатай жывёлай. Менавіта аб селекцыйнай рабоце ў гэтым напрамку мы перш за ўсё і вырашылі спытаць вучоных РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі».

Калі, напрыклад, у свінагадоўлі ў нашай краіне дзесяцігоддзямі разводзілася мінімум сем парод і дзякуючы скрыжаванню жывёлаводы стабільна атрымлівалі прыбаўку прадукцыйнасці 10-11 % — спрацоўвала гібрыдная сіла, то ў дачыненні да буйной рагатай жывёлы доўгі час пераважалі чорна-пярэстая парода і галштыны, распавядае **першы намеснік генеральнага дырэктара РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі», доктар сельскагаспадарчых навук, акадэмік Іван ШЭЙКО**. У 1960-я ў малочнай жывёлагадоўлі рэспублікі актыўна развівалася кшталту сямі-васьмі парод буйной рагатай жывёлы, кажа навуковец. Але бліжэй да 1970-х асноўнай на тэрыторыі сучаснай Беларусі стала чорна-пярэстая парода кароў — такое рашэнне прыняў Пётр Машэраў.



Карова новай галштынскай папуляцыі малочных жывёл.

— Рашэнне было разумным на той момант: іншыя пароды жывёлы значна саступалі чорна-пярэстай па надоях, — тлумачыць акадэмік.

У гэтым кірунку і ішла селекцыйная работа. У 2004 годзе была зацверджана першая айчынная парода малочнай жывёлы беларускай селекцыі — беларуская чорна-пярэстая, якая дае і малако, і мяса. А ў 2020-м з'явілася і ўласна малочная парода белгалштын, якую навукоўцы стварылі каля 30 гадоў: яна дае 10—13 тысяч літраў малака за лактацыю.

— Пасля вайны сельская гаспадарка нашай рэспублікі зрабіла рывок менавіта дзякуючы сальным пародам свіней і мяса-малочным пародам буйной рагатай жывёлы, — адзначае Іван Шэйко. — Між тым ЗША, Канада, Ізраіль, Заходняя Еўропа пайшлі па іншым шляху: зрабілі стаўку на спецыялізацыю: іншымі словамі, развядзенне чыста малочных і чыста мясных парод. Па шляху спецыялізацыі парод ідзе сёння і беларуская жывёлагадоўля.

— Белгалштын — менавіта малочная парода. Таксама ў нашай краіне прадстаўлены пяць-шэсць мясных парод: шарале, лімузіны, герэфорды... Яны не доіцца, а разводзяцца менавіта з мэтай атрымання высакаякаснай ялавічыны.

Уласнай мяснай пароды ў Беларусі пакуль не створана. А вось апошняе дасягненне ў малочнай жывёлагадоўлі — белгалштын — дазваляе, акрамя высокіх надояў, атрымліваць таксама чыстапародных быкоў-вытворцаў з высокай генетычнай каштоўнасцю, якіх перш даводзілася закупляць у Заходняй Еўропе для падтрымання чысціні пароды, а цяпер быкі пароды белгалштын запатрабаваныя і за межамі нашай краіны.

Да нядаўняга часу галштынізацыя была адным з вядучых напрамкаў у сусветнай малочнай жывёлагадоўлі, распавядае навуковец. Але калі доўгія гады селекцыя вялася ў напрамку тлустасці малака, у апошні час адбыўся паварот у бок яго бялковага складніка. Менавіта такое высокабялковае малако даюць так званыя чырвоныя беларускія каровы, якія спакон веку разводзіліся на нашай тэрыторыі. Адраджэнне гэтай пароды цяпер — адна з асноўных задач, якую ставяць перад сабой навукоўцы. Ёсць і яшчэ адзін аргумент на карысць гэтага кроку.

— У 1970-я (я якраз тады пачынаў працаваць у сферы навуковага забеспячэння жывёлагадоўлі) яшчэ не існавала ДНК-тэхналогій, і галштынізацыя здавалася найбольш разумным шляхам развіцця, — тлумачыць прафесар Шэйко. — Сёння генетыкі ўсяго свету адзначаюць: у галштынаў малака вельмі шмат, але, з прычыны гэтага, з часам у іх парушылася спалучальнасць генаў. У сувязі з чым назіраецца рост колькасці людзей, чый арганізм не прымае малако і малочныя прадукты — у першую чаргу дзяцей, а таксама людзей пажылых і аслабленых хранічнымі хваробамі.

Таму сёння адна з важных задач для генетыкаў — паляпшэнне генатыпа галштынскай пароды, што паспрыяе росту засваяльнасці малака арганізмам чалавека. Інфармацыя для спажыўца: «генетычна правільнае» малако ўжо ёсць у нашых крамах. Шукаем упакоўкі з маркіроўкай А2 — у такім малацэ будзе ідэальнае спалучэнне генаў.

Яшчэ адно вырашэнне пытання з засваяльнасцю малочных прадуктаў — адраджэнне чырвонай беларускай жывёлы, чыё малако мае ідэальны генетычны склад, а гэта значыць, што яно добра засвойваецца і дзецьмі, і пажылымі. Плюс пароды — і высакаякасная ялавічына, параўнальная з мясам спецыялізаваных мясных парод.

Пытанне аб адраджэнні чырвонай беларускай жывёлы было ўзнята на дзяржаўным узроўні ў 2018 годзе, распавядае Іван Паўлавіч. Асновай для селекцыйнай работы стала невялікае пагалоўе такіх кароў, якое захавалася ў гаспадарцы «Новы Двор» Свіслацкага раёна. У 2019—2020 гадах у нашу краіну было завезена 1300 галоў генетычна блізкіх беларускім чырвоных кароў і бычкоў з Даніі і Галандыі.



Загадчык лабараторыі ДНК-тэхналогій РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па жывёлагадоўлі» Уладзімір СІМАНЕНКА.

— Цяпер ідзе актыўная работа ў гэтым кірунку. Новую чырвоную пароду плануем зацвердзіць да 2030 года, — адзначае суразмоўца.

Традыцыйна на вывядзенне новай пароды буйной рагатай жывёлы патрабуецца каля 30 гадоў. Але тут работа пачалася не на «пустым месцы», і навукоўцы плануюць завяршыць яе значна хутчэй.

## АБ КАНКУРЭНЦЫІ МЯСА І САЛА

— Наш інстытут заўсёды ўваходзіў у эліту даследчых арганізацый, якія займаюцца навуковым забеспячэннем сельскай гаспадаркі. Але быў час, калі беларускія селекцыянеры не задумваліся аб стварэнні ўласных парод сельскагаспадарчай жывёлы, — успамінае Іван Паўлавіч. — І толькі ў канцы 1980-х мы вырашылі паспрабаваць.

«Выпрабавальнай» стала беларуская мясная парода свіней, зацверджаная ў 2000 годзе. У свінагадоўлі, дарэчы, работа па вывядзенні новых парод ідзе значна хутчэй. Гэта звязана з прадукцыйнасцю: карова нараджае адно цяля ў год, свінаматка за той жа перыяд здольная прынесці 20—25 парасят. Асновай беларускай мяснай пароды стала яшчэ савецкая распрацоўка.

— Доўгі час на тэрыторыі Беларусі разводзіліся толькі дзве пароды свіней (буйная белая і чорна-пярэстая). Ад скрыжавання матак буйной белай пароды з кнырамі чорна-пярэстай пароды сальнага кірунку ўтвараліся помесі, якія хутка растуць. Такім чынам атрымлівалі буйных парсючкоў з тоўстым шпікам — беларуская свініна заўсёды славілася высокай якасцю, — распавядае суразмоўца. — У 1971 годзе ЦК вырашыла стварыць у Саюзе першую мясную пароду свіней — тады «ў модзе» быў мясны, а не сальны кірунак. Мне пашчасціла ўдзельнічаць у стварэнні гэтай пароды з беларускага боку. Планавалася назваць яе савецкая мясная, а ў нас распрацоўваўся так званы беларускі ўнутрыпародны тып. Акрамя таго, былі створаны палтаўскі тып, заходні тып (у Ленінградзе), свой тып у Сібіры і яшчэ адзін — у Цэнтральным Чарназем'і. Найлепшымі аказаліся беларускі і палтаўскі ўнутрыпародныя тыпы. На іх аснове з часам і была створана беларуская мясная парода.

Сёння ў беларускай свінагадоўлі вельмі багаты асартымент парод. Гэта і айчынныя пароды, і ландрас, і ёркшыр, і буйна-белая.

— На жаль, традыцыйная спакон веку для Беларусі чорна-пярэстая парода сёння патрабуе аднаўлення, і мы робім гэта з вялікай цяжкасцю. Якасць свініны ў чорна-пярэстай была неверагодная — ні адна парода ні ў Беларусі, ні ў Расіі, ні ва Украіне не можа з ёй параўнацца. Але гэтая парода — сальнага кірунку, а сальная свініна затрачвае на 30 % больш сродкаў на вытворчасць кілаграма канчатковага прадукту. 70 % сабекошту свініны — гэта кармы, астатняе (уключаючы абслугоўванне фермы і зарплату персаналу) — усяго толькі 30 %. А сала — энергетычны прадукт, у які прыйдзецца ўкласці на трэціну больш кармоў, чым у мяса. Адпаведна, рашэнні гаспадаркі прымаюць на карысць мяса, а не сала.

— Я напісаў дзясяткі артыкулаў у абарону чорна-пярэстай беларускай пароды свіней. На шчасце, паступова яна адраджаецца, — падкрэслівае прафесар Шэйко.



У 2013—2016 гадах у Беларусь было завезена каля тысячы галоў элітных авечак. Пароды адаптаваліся і паказваюць добрыя вынікі.

## АБ ТОНКІМ РУНЕ І АВЕЧЫХ СЫРАХ

Сёння наогул адраджаюцца забытыя галіны жывёлагадоўлі. Напрыклад, беларуская авечкагадоўля, пра якую, як да нядаўняга часу здавалася, можна забыцца назаўжды.

— Напрыканцы дваццатага стагоддзя авечкагадоўля ў Беларусі была шырока развіта — пагалоўе ў цэлым па краіне налічвала больш за мільён жывёл, — распавядае **загадчык лабараторыі НПЦ па жывёлагадоўлі, кандыдат сельскагаспадарчых навук Юрый ГЕРМАН**. — Авечак разводзілі ва ўсіх абласцях Беларусі, найбольш актыўна — на Гомельшчыне і Берасцейшчыне. Пераважалі пароды раманаўская і прэкас. Але пасля чарнобыльскай аварыі беларуская авечкагадоўля практычна сышла на нішто. На тое была жыццёвая неабходнасць — воўна авец назапашвала радыяцыю.

У 2012 годзе быў выдадзены ўказ кіраўніка дзяржавы аб адраджэнні авечкагадоўлі. І ў 2013—2016 гадах з Венгрыі, Францыі, Аўстрыі, Польшчы, краін Прыбалтыкі ў Беларусь было завезена каля тысячы галоў элітных авечак парод тэксель, мерыналандшаф, нямецкі мерынос, суфалк, іль-дэ-франс, асканійская, лакаюнэ і г. д.

Цяпер пагалоўе авец у нашай краіне налічвае каля 80 тысяч жывёл, і да 2025 года прадугледжана атрыманне каля 150 тысяч авечак ва ўсіх катэгорыях гаспадарак. Усяго ў краіне на сёння — каля 20 парод, селекцыйная работа вядзецца ў дачыненні да 11 з іх. У планах селекцыянераў — уласныя мясныя пароды і павышэнне якасці воўны для лёгкай прамысловасці.

— Мясная авечкагадоўля мае вялікі экспартны патэнцыял, — адзначае Юрый Герман. — З гэтай прычыны ў Лагойскім раёне з удзелам замежнага капіталу пабудаваны сучасны жывёлагадоўчы комплекс, куды завезлі французскую пароду мяса-шэрснага кірунку іль-дэ-франс. Парода ў нас адаптавалася і паказвае добрыя вынікі. Напрыклад, жывёл беларускай селекцыі гэтай пароды прадпрыемства з поспехам прадае ў Расію і Казахстан. Таксама запатрабаваныя беларуская селекцыя суфалка і лакаюнэ.

Аб гэтай, апошняй, пародзе — асаблівая размова. ТАА «Лошыцкі камбікормавы завод» сёння развівае малочны кірунак у авечкагадоўлі. З авечага малака вырабляюцца найсмачнейшыя сыры, якія таксама з поспехам рэалізоўваюцца на экспарт.

Але калі мясная і малочная авечкагадоўля развіваюцца актыўна, то якасць воўны авечак, вырашчаных у нашай краіне, далёка не заўсёды падыходзіць для патрэб сучаснай лёгкай прамысловасці.

— Сёння адна з найважнейшых задач — забяспечыць наш легпрам якаснымі шэрсцю і скурай, — адзначае навуковец.

Але поўнае імпартазамяшчэнне па гэтых пазіцыях пакуль не ўяўляецца магчымым: у Беларусі шмат узараных зямель, а авечка — пашавая жывёла, і менавіта ўмовамі яе ўтрымання вызначаецца якасць воўны.

Каб вырашыць гэтае пытанне, селекцыянеры плануюць стварыць беларускую пароду авечак з высакаякаснай воўнай, прыстасаваную як да нашага клімату, так і да ўмоў утрымання. Работа гэтая пакуль на самым пачатковым этапе, і на яе спатрэбіцца не менш за дзесяць гадоў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Краіна здароўя

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

## КОВІД СЫХОДЗІЦЬ, АЛЕ ПІЛЬНАСЦЬ ГУБЛЯЦЬ НЕ ВАРТА

**Сітуацыя з каранавіруснай інфекцыяй у Беларусі спрыяльная — назіраецца ўстойлівае зніжэнне захворвання. Аднак вірус працягвае цыркуляваць, таму расслабляцца не трэба.**

Як нагадала **загадчыца аддзела эпідэміялогіі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ВЫСОЦКАЯ**, 5 мая Сусветная арганізацыя аховы здароўя прыняла рашэнне аб зняцці статусу надзвычайнай сітуацыі ў галіне грамадскай аховы здароўя адносна каранавіруснай інфекцыі.

— Аднак гэта не значыць, што вірус перастаў існаваць, ён працягвае цыркуляваць, у тым ліку і на тэрыторыі нашай краіны. У нас сітуацыя з каранавірусам спрыяльная, мы назіраем устойлівае зніжэнне захворвання і выяўляльнасці каранавіруса, — адзначыла Вераніка Высоцкая.

У нашай краіне эпідэміёлагі працягваюць эпідэміялагічнае сачэнне за захворваннем.

— Працягваецца штодзённы маніторынг. Хацелася б нагадаць, што тыя правілы, якія мы рэкамендавалі ў перыяд уздыму захворвання, — пазбягаць закрытых памяшканняў і скаплення людзей, праветрываць пакоі і рабіць вільготную прыборку і гэтак далей — трэба працягваць выконваць для ўласнай бяспекі і зніжэння рызыкі заражэння, — падкрэсліла эпідэміёлаг.

Будзьце пільныя!

## АД АДРУ ДАПАМОЖА ТОЛЬКІ ВАКЦЫНАЦЫЯ

### Чаму зноў згадалі пра гэту інфекцыю?

**Апошнім часам не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе рэгіструюцца выпадкі захворвання на адзёр. Звычайна інфекцыя праходзіць у лёгкай форме, але здараюцца і цяжкія ўскладненні, таму вакцынавацца неабходна ўсім. Пра небяспеку гэтай надзвычай заразнай інфекцыі нагадаў загадчык кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Ігар КАРПАЎ.**



— Гэта паталогія, ад якой апошнім часам адвыклі дзякуючы паўнамерным намаганням па вакцынацыі насельніцтва. Цяпер нам трэба будзе абнавіць веды нашых спецыялістаў па гэтым пытанні, асабліва маладых. Беларусь у канцы 2010-х — пачатку 2020-х гадоў спраўлялася з вельмі няпростай сітуацыяй, звязанай з адром. У нас былі гады, калі ён не рэгістраваўся наогул, былі сітуацыі, калі рэгістраваўся ў дзясятках выпадкаў. Статыстычна на 9-мільённую краіну мы і нашы калегі-эпідэміёлагі спраўляемся вельмі добра. Гэта наша дасягненне, таму што вакцынацыя і рэвакцынацыя даюць свой эфект, — адзначыў Ігар Карпаў.

Паводле яго слоў, у краіне гэта захворванне часцей за ўсё працякае няцяжка, хаця ёсць выпадкі з разгорнутай клінічнай карцінай гэтай хваробы. І тут важна строга прытрымлівацца тых інструкцый і рэкамендацый, якія дадзены па выкананні хатняга рэжыму або ізаляцыі, бо адзёр — вельмі кантагіёзнае захворванне.

— Індэкс кантагіёзнасці роўны 100 %. Гэта значыць калі людзі знаходзяцца і блізка кантактуюць у закрытым памяшканні, то вельмі верагодна, што яны таксама захварэюць. Ратуе толькі праведзеная раней вакцынацыя.

Краіны па-рознаму падыходзяць да канцэпцый вакцынацыі, але ўсе прызнаюць яе неабходнасць. Ігар Карпаў растлумачыў, чаму нават у заможных краінах пытанне аб вакцынацыі актуальнае.

— Рэч у тым, што калі існуюць дэфіцыт вітаміну А, вялікая колькасць аслабленых невакцынаваных дзяцей і людзей з выяўленым імунадэфіцытам, то адзёр можа працякаць у даволі цяжкай форме, даваць запаленне лёгкіх і цэлы шэраг іншых больш сур'ёзных ускладненняў, звязаных з наступным паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы. Яны хоць і нячастыя, але дастаткова сур'ёзныя. Таму свет прыняў гэту канцэпцыю з вакцынацыяй, — падкрэсліў загадчык кафедры.

Скажыце, доктар...

# ПАЧАЎСЯ СЕЗОН ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НА АЛЕРГІЮ

### Як узяць хваробу пад кантроль?

**Штогод ад праяў сезоннай алергіі пакутуе 40–45 тысяч беларусаў. І праблемы ў большасці з іх абвастраюцца вясной. Раз на кожныя тры-пяць гадоў здараецца пік квітнення дрэваў, калі канцэнтрацыя пылку вышэйшая, чым звычайна, а алергікі, адпаведна, пакутуюць мацней. І, па назіраннях спецыялістаў, менавіта сёлета такі год. Парады, якія дапамогуць супрацьстаяць сезоннай алергіі, далі спецыялісты.**



### ЧЫМ АДМЕТНЫ СЁЛЕТНІ СЕЗОН?

— Штогод сезон алергіі пачынаецца ў розны час. Летась пік квітнення дрэваў адзначаўся з 1 да 10 мая і быў нязначны. Сёлета за кошт таго, што вясна была дастаткова ранняя, ужо ў другой палове красавіка мы бачылі пад'ём захваральнасці. І, трэба сказаць, у цэлым гэтай вясной мы бачым сур'ёзны рост захваральнасці і пік выяўленасці сімптомаў, — дзеліцца **галоўны пазаштатны спецыяліст па дзіцячай алергалогіі Міністэрства аховы здароўя, загадчык алергалагічнага аддзялення 4-й дзіцячай клінічнай бальніцы Мінска Дзмітрый БУЗА**. — Нават у тых дзяцей, бацькі якіх пра хваробу ведаюць і праводзілі ўсе прафілактычныя мерапрыемствы, вялікая канцэнтрацыя алергену прыводзіць да таго, што не толькі развіваюцца сімптомы рынакан'юктывіту, але і фарміруецца бранхіяльная астма. Хачу звярнуць увагу, што сёлета ідзе актыўнае пыленне дрэваў, і яно будзе працягвацца прыкладна да канца мая. Для тых, у каго алергія на зёлкі і палын, час алергіі надыдзе летам.

### НАКОЛЬКІ РАСПАЎСЮДЖАНЫ ПАЛІНОЗ?

Штогод да спецыялістаў з праблемамі сезоннай алергіі звяртаецца 40—45 тысяч беларусаў, гэта менш за 1 % насельніцтва краіны. Пры гэтым спецыялісты лічаць, што захворванне недавыяўлена, бо ў Расіі і Еўропе лічбы большыя.

— У Еўропе частата зваротаў вагаецца ад 2 % на поўначы (Швецыя, Нарвегія) да 34–36 % на поўдні (Італія, Партугалія, Іспанія). Калі браць аналагічныя лічбы ў Расіі, то ў Саратаўскай і Астраханскай вобласці частата алергічнага рыніту складае 10—12 %, а ў рэгіёнах паўночней — да 5%. У нас пылковая алергія і сезонныя праявы алергічных хвароб недадыягнаставаны, — дзеліцца меркаваннем **галоўны пазаштатны алерголаг-імунолаг Міністэрства аховы здароўя, дацэнт кафедры пульманалогіі і фтызіятрыі з курсам алергалогіі, імуналогіі і прафпаталогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Сяргей АРЦІШЭЎСКІ.**

Гэта звязана з тым, што не ўсе пацыенты трапляюць да ўрачоў-алерголагаў, часам атрымліваюць лячэнне ў прыватных медыцынскіх цэнтрах. Пры гэтым у 30 % хворых на сезонную пылковую алергію яна ператвараецца ў бранхіяльную астму. А гэта і абмежаванні ў выбары прафесіі, і пастаянны прыём лекаў.

### У ЯКІМ УЗРОСЦЕ ВЫЯЎЛЯЮЦЬ?

Любая алергія паходзіць з дзяцінства, звычайна захворванне пачынаецца ў сем-дзесяць гадоў. Але выяўляцца можа значна пазней. Позняя дыягностыка — праблема не толькі нашай, але і іншых краін. Бо звычайна, калі ў дзіцяці адзначаецца закладзенасць носа, чханне, сверб вачэй, першы дыягназ, які ставяць пры звароце да ўрача, — вірусная інфекцыя. І толькі калі сітуацыя паўтараецца некалькі гадоў запар, педыятр можа западозрыць алергію і накіраваць да алерголага. Затрымка ў пастаноўцы дыягназу складае 2-3 гады.

Захворванне можа пачацца ў дарослым узросце. Яго правакуе кантакт з пэўнай колькасцю алергену, што і прыводзіць да маніфестацыі хваробы.

### ЦІ ПЕРАДАЕЦЦА Ў СПАДЧЫНУ?

Пры любой алергіі можна западозрыць генетычную схільнасць. Калі захворванне маюць абодва бацькі, рызыка развіцця ў дзіцяці складае каля 80 %, адзін з бацькоў — 40—50 %, прычым рызыка вышэйшая, калі на алергію пакутуе маці. Адметна, што перадаецца не само алергічнае захворванне, а схільнасць да яго, таму ў дзіця алергія можа развіцца на зусім іншы кампанент ці мець іншыя праявы.

### ЦІ МОЖНА ПАЗБАВІЦЦА АД АЛЕРГІІ?

Пры праявах хваробы выкарыстоўваецца сімптаматычная тэрапія. Гэта антыгістамінныя лекавыя прэпараты, атапічныя глюкакортыкастэроіды і іншыя лекі. А вось узяць алергію пад кантроль дапамагае алергенспецыфічная імунатэрапія (АСІТ). Яна праводзіцца восенню і зімой. Пацыент атрымлівае невялікія дозы алергену, якія прывучаюць імунную сістэму не рэагаваць на іх.

— Калі пацыент праходзіць поўны курс АСІТ, разлічаны на тры гады, то ў 80—85 % выпадкаў наступае стойкая рэмісія цягам наступных пяці гадоў, — кажа Сяргей Арцішэўскі. — Гэта той метад, які дазваляе ўзяць захворванне пад кантроль. У астатніх выпадках мы рэкамендуем пацыентам мяняць геаграфічную шырату на перыяд палінацыі, хадзіць у гэты час у акулярах, не выходзіць на вуліцу ў сухое ветранае надвор'е, не наведваць лесапаркавыя зоны, часцей рабіць прыбіранне, мыць адзенне пасля выхаду на вуліцу.

Спецыяліст адзначыў, што апошнім часам узніклі пэўныя складанасці з лячэннем сезоннай алергіі метадам АСІТ. Гэта звязана з абмежаваннямі ў пастаўках алергенаў, што адбылося з прычыны рэканструкцыі вытворчых магутнасцяў у Расіі. З іншых краін іх не дастаўляюць.

— Да лютага мінулага года мы атрымлівалі некаторыя кампаненты ва Украіне, цяпер па зразумелых прычынах яны недаступныя. І засталіся толькі пастаўкі з Расіі. З еўрапейскімі краінамі ў нас няма кансэнсусу, бо пастаўляюцца толькі прэпараты так званага крытычнага імпарту, да якіх алергены не адносяцца, — кажа Сяргей Арцішэўскі. — Таму маем недастатковую колькасць пацыентаў, якія праходзяць спецыфічную імунатэрапію. Калі раней у рэгіёне гэта было 600—800 чалавек, то сёння — 30—40. Але гэта прычыны, якія ад нас не залежаць.

Што датычыцца базавай тэрапіі ад бранхіяльнай астмы, то тут часткова выкарыстоўваюцца прэпараты айчыннай вытворчасці, часткова імпартныя. Усе яны маюцца ў наяўнасці, і пацыенты іх атрымліваюць. Прэпараты для купіравання прыступаў, якія выкарыстоўваюцца ў экстранных сітуацыях, як імпартнай, так і беларускай вытворчасці, таксама ёсць у наяўнасці.

Пры сімптаматычным лячэнні алергіі выкарыстоўваюцца антыгістамінныя прэпараты. Пацыенты, якія даўно хварэюць, ведаюць іх, як і тое, што перыядычна іх варта мяняць. Антыгістамінныя прэпараты першага пакалення выклікаюць шэраг пабочных эфектаў, сярод іх — седатыўны эфект, сухасць скурных покрываў і іншыя, таму яны выкарыстоўваюцца абмежавана ў лячэнні хранічных алергічных хвароб. Упор звычайна робіцца на прэпараты другога пакалення —ларатадзін, хіфенадзін, цыцэрызін і іншыя. Пацыент сам мусіць вызначыць прэпарат і дозу, ад якой ён будзе адчуваць сябе камфортна. А пры падборы варта звяртацца да спецыяліста.

### МІФЫ ПРА ХВАРОБУ

Першы з іх звязаны з тым, што пры алергіі абавязкова варта знайсці алерген.

— Не заўсёды захворванні, якія адносяцца да катэгорыі алергічных, — атапічны дэрматыт, хранічная крапіўніца, бранхіяльная астма, — справакаваны алергенам. Мы часта сутыкаемся з пацыентамі, мэта якіх — знайсці алерген, здаючы шматлікія аналізы і марнуючы грошы. Гэта катэгарычна не паказана. Толькі ўрач-алерголаг вызначае, якія лабараторныя даследаванні трэба правесці і які метад дыягностыкі варта прымяніць, — кажа Дзмітрый Буза.

Яшчэ адзін міф — алергія на тапаліны пух. Насамрэч, пух з'яўляецца пераносчыкам пылку. Адпаведна алергія ў вас не на тапаліны пух, а на той пылок, які ён пераносіць. Звычайна гэта пылок злакаў тыпу цімафеекі.

### ШТО НЕЛЬГА ПРЫ АЛЕРГІІ?

Пры алергіі супрацьпаказана фітатэрапія. Калі маецца алергія на пылок раслін, часта будзе рэакцыя і на самі травы. Займаючыся лячэннем дзіцяці, у якога ёсць паліноз, фітапрэпаратамі, можна атрымаць адмоўны эфект. Тое самае тычыцца і ўжывання мёду — асабліва шмат пылку ўтрымлівае ранні прадукт.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

17 мая 2023 г. № 16 (702)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

# Справамі дэманстраваць вынік

## Заклікала Наталля Качанава членаў Маладзёжнага парламента і БРСМ

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля КАЧАНАВА ўзяла ўдзел у дыялогавай пляцоўцы з членамі Маладзёжнага парламента і БРСМ. Паколькі сенатары шмат сустракаюцца з моладдзю, яны добра ведаюць пытанні, што яе хвалююць. Наталля Качанава таксама нярэдка кантактуе асабіста са студэнтамі ВНУ, навучэнцамі каледжаў, старшакласнікамі. Таму на сустрэчу спікер верхняй палаты парламента прыйшла з шэрагам прапаноў, а яшчэ выслухала пажаданні маладзёжных лідараў.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.





### «Маладзёжны савет — добрая школа для маладых людзей»

Наталля Качанава адзначыла, што калі раней моладзь была не такая палітызаваная, то сёння яна актыўна цікавіцца жыццём краіны, падзеямі, якія разгортваюцца вакол, знешняй і ўнутранай палітыкай.

— Мы разумеем, што моладзь — самая рухомая частка грамадства, і яна схільная да ўплываў, прычым не толькі станоўчых, а і дэструктыўных, якія насаджаюцца маладым людзям. І работа такіх найбольш масавых маладзёжных арганізацый, як БРСМ, маладзёжныя саветы, якія ёсць ва ўсіх раёнах краіны, павінна быць выбудавана правільна.

Спікер падкрэсліла, што сёння з Саветам Рэспублікі працуе вялікая колькасць маладых людзей з Маладзёжнага парламента і саветаў. Яны прысутнічаюць на розных мерапрыемствах, прыёмах грамадзян па асабістых пытаннях, удзельнічаюць у пасяджэннях сесій. І маладзёжныя арганізацыі з'яўляюцца для іх добрай школай.

— Тыя маладыя людзі, якія скончылі сваю работу ў Маладзёжным савеце, сёння эфектыўна працуюць ва ўсіх галінах эканомікі, у гуманітарнай сферы, займаюцца пытаннямі сацыяльнай палітыкі. І гэта добрая школа для маладых людзей. Яны могуць данесці сваім равеснікам інфармацыю аб той рабоце, якая праводзіцца ў нашай краіне, якія законапраекты распрацоўваюцца, якая сітуацыя складваецца. Вашу ролю ў рабоце з моладдзю нельга пераацаніць, — адзначыла Наталля Качанава.

Яна лічыць, што калі малады чалавек — член БРСМ, то гэта ўжо лідар, чалавек, які мае сваю грамадзянскую пазіцыю. Але пры гэтым важна не навязваць яе іншым, а сваім прыкладам зацікавіць астатнюю моладзь.

— Варта працаваць не толькі з членамі сваіх арганізацый, але і з тымі маладымі людзьмі, якія імкнуцца адмежавацца ад гэтага, якім не зусім цікава. Цікава будзе тады, калі вы будзеце сваімі справамі дэманстраваць вынік.

Старшыня верхняй палаты парламента дала маладым лідарам параду: не адштурхоўваць ад сябе людзей і не надзяваць на сябе кароны, маўляў, мы тут такія важныя, а наадварот — сваімі справамі прыцягваць моладзь у свае шэрагі.

### «Калі чалавек адчувае справядлівасць, тады лягчэй жыць»

Гэта асабліва важна ў цяперашні час, з улікам сітуацыі, якая складваецца ў свеце.

— Вы бачыце, што адбываецца, як ідзе збіранне воінскіх фарміраванняў вакол нашай краіны. Амерыканцы кажуць: мы ў Кітаі не бачым праціўніка, мы збіраемся ваяваць з Расіяй. А што гэта азначае? Расія ж побач з нашымі граніцамі. І рукамі каго яны збіраюцца ваяваць? Яны не будуць ваяваць з Амерыкі, а будуць дасылаць узбраенне і ўзброеныя фарміраванні да нашых граніц. Тут яны сёння ствараюць плацдарм для сваіх далейшых мэт, якія нават не хаваюць. Таму мы сёння мусім быць адзінымі ў адстойванні суверэнітэту і незалежнасці нашай краіны, тых інтарэсаў і той палітыкі, якая праводзіцца ў нашай краіне. А яна міралюбівая, накіраваная на простых людзей, якія жывуць на гэтай зямлі. Каб быў камфорт, справядлівасць. Прэзідэнт часта агучвае тэзіс, што справядлівасць мусіць быць ва ўсім. Калі чалавек адчувае справядлівасць, тады лягчэй жыць, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Таму мы столькі ўвагі ўдзяляем рабоце з маладзёжнымі арганізацыямі — для таго, каб у маладых людзей было аб'ектыўнае і адэкватнае разуменне працэсаў, якія адбываюцца.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Дыялог з жанчынамі і міжпарламенцкае супрацоўніцтва



● Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава правяла сустрэчу з прадстаўніцамі Беларускага саюза жанчын Гродзенскай вобласці. Гаворачы аб правядзенні такіх сустрэч, спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што ідэя ўзнікла даўно. «Калі мы выязджаем у працоўныя калектывы, арганізацыі, установы нашай краіны, сустракаемся з людзьмі, з якімі праводзім у форме дыялогавых пляцовак сустрэчы, чаму б не сустрэцца проста з жанчынамі, якія з'яўляюцца членамі Беларускага саюза жанчын, — заўважыла яна. — У нас дастаткова шмат такіх жанчын па ўсёй краіне. І я хачу сказаць, што апошнім часам Беларускі саюз жанчын прырастае новымі арганізацыямі, новымі сябрамі. Я бачу тыя мерапрыемствы, якія праводзяцца, яны цікавыя, і жанчыны шукаюць магчымасці ўступіць у гэтую арганізацыю. Часам у мяне нават пытаюцца, як трапіць у саюз жанчын». Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, грамадскім арганізацыям трэба так працаваць, каб людзі хацелі прыйсці туды па воклічы сэрца, па волі лёсу, каб прыйсці і разам рабіць вельмі важныя, патрэбныя справы для сваёй арганізацыі, для краіны ў цэлым.

Падчас сустрэчы ў Гродне Наталля Качанава агучыла, чым займаецца Савет Рэспублікі, расказала, якія законапраекты прымаюцца, чым жыве краіна ў плане работы над законапраектамі, як рэалізоўваюцца задачы, пастаўленыя на Усебеларускім народным сходзе, усе тыя пытанні, аб якіх гаварыў Прэзідэнт у Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Спікер падкрэсліла, што яна заўсёды адкрыта да дыялогу: «Я заўсёды знайду час сустрэцца або перагаварыць, каб аказаць дапамогу або садзейнічанне, выслухаць прапановы, якія будуць цікавыя і важныя сёння не толькі для нас заканадаўча, але ў цэлым для нашай краіны». На сустрэчы прысутнічалі 120 прадстаўніц БСЖ Гродзенскай вобласці. Да канца года Наталля Качанава плануе наведаць усе рэгіёны краіны.

У размове з журналістамі спікер падзялілася меркаваннем аб ролі і магчымасцях сучаснай беларускай жанчыны. «Даваць характарыстыкі жанчынам заўсёды няпроста, — падкрэсліла яна. — Сучасная беларуская жанчына ініцыятыўная, гэта жанчына, якая можа, на мой погляд, усё: гадаваць дзяцей, ствараць сям'ю, працаваць на вытворчасці, на прадпрыемстве, кіраўніком і рабочым. Па-мойму, практычна няма такіх ужо прафесій, дзе ні працавалі б нашы жанчыны». Наталля Качанава адзначыла, што адным з прыкладаў уцягнутасці нават у мужчынскія прафесіі з'яўляецца той факт, што конкурс пры паступленні ў Акадэмію МУС для дзяўчат складае літаральна 10 чалавек на месца. «Гэта значыць, жанчыны сёння ва ўсіх сферах жыццядзейнасці прымаюць вельмі актыўны ўдзел, — акцэнтавала ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі. — Але самае галоўнае, калі мы разам аб'ядноўваемся і робім вельмі патрэбную, важную справу, якая забяспечвае мір, стабільнасць і бяспеку нашай краіне. Гэта вельмі важна».

● Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый Бельскі 16—17 мая бярэ ўдзел у мерапрыемствах спецыяльнай сесіі Мілі Меджліса Азербайджанскай Рэспублікі, прысвечанай 100-годдзю нацыянальнага лідара Гейдара Аліева, якія праходзяць у Баку. Падчас спецыяльнага пасяджэння Валерый Бельскі агучыў прывітанне-віншаванне Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай з нагоды 100-годдзя з дня нараджэння легендарнага азербайджанскага лідара. Валерый Бельскі перадаў у музей Гейдара Аліева экзэмпляр нумара беларускай газеты, у якім змяшчаецца артыкул з аналізам ролі Гейдара Аліева як вядомага дзеяча. Удзельнікі мерапрыемства ўсклалі вянок да магілы юбіляра і азнаёміліся з дзейнасцю Цэнтра Гейдара Аліева.

**Паводле БелТА.**

# Справамі дэманстраваць вынік

### «Улада ў краіне ў нас народная»

Спікер акцэнтавала ўвагу на тым факце, што прынятая праграма патрыятычнага выхавання накіравана не толькі на моладзь, але і на грамадства ў цэлым. Таму і былі прыняты законы аб асновах грамадзянскай супольнасці, аб Усебеларускім народным сходзе.

Яна падкрэсліла, што наша дзяржава — сацыяльна арыентаваная, але, для таго каб сфарміраваць больш магутны бюджэт, трэба, каб насельніцтва працавала.

— А некаторыя, як вядома, працаваць не хочуць. Але затое хочуць карыстацца сацыяльнымі выгодамі, якія дае дзяржава: выплатамі пенсій, дапамог, забеспячэннем бяспекі, бясплатнай адукацыяй, бо гэта ўсё з бюджэту, у які ўкладваецца кожны працоўны чалавек. Таму такая праблема ёсць, бо некаторыя не разумеюць, што кожны чалавек павінен працаваць.

Наталля Качанава прывяла прыклад: эканоміка не прасела ва ўмовах надзвычай жорсткіх санкцый, а, наадварот, паказвае сваю эфектыўнасць.

— Тыя задачы, якія нам ставіў Прэзідэнт яшчэ 20 гадоў таму па імпартазамяшчэнні, па навядзенні парадку і добраўпарадкаванні, экалагічнай бяспецы, — усё ўплялося ў гэту канву, — сказала яна. — І калі мы сёння адчуваем такі ціск, мы бачым: вось яна, эфектыўнасць. Таму мы ўсе павінны сёння быць адзіныя і працаваць на тварэнне, каб кожны разумеў і шанаваў тыя дасягненні, якія ёсць у нашай краіны.

### «Праявi сябе, папрацуй — і заўтра ў цябе будзе пасада»

— Прымаючы закон аб дзяржслужбе, мы казалі, што гэта падобна на ваенную службу — дзяржслужачы павінен служыць сваёй краіне і народу, — нагадала Наталля Качанава. — Калі чалавек адказна працуе, выконвае ўскладзеныя на яго абавязкі, мае сур'ёзную грамадзянскую пазіцыю, ён не застанецца незаўважаным, наверце. І моладзь павінна тое разумець. Праяві сябе, папрацуй — і заўтра ў цябе будзе пасада, бо шмат у каго складваецца ўражанне, што калі яны атрымалі спецыяльнасць, то адразу пасля ВНУ стануць вялікімі начальнікамі. Паспееш яшчэ паначальстваваць у сваім жыцці.

На думку Наталлі Качанавай, работа маладых людзей павінна быць у першую чаргу эфектыўнай, тады іх намаганні абавязкова заўважаць.

— Мы сёння павінны працаваць так, каб людзі нам верылі, каб людзі разумелі, што ўсё, што робіць улада ў краіне, гэта правільна, — сказала яна. — Бо людзі ва ўладзе не маюць паралельных бізнесаў і не сядзяць на мяшках грошай, як алігархі. У нас у краіне гэтага няма. Калі ты хочаш жыць сумленна і працаваць на карысць краіне, ты можаш ісці на дзяржаўную службу. А калі ты хочаш жыць багата, то павінен сам прабіваць сабе шлях. Я не кажу, што ўсе прадпрымальнікі запар — багатыя людзі. Вядома не. Да таго ж бізнес — патрэбная справа для краіны, складае трэць нашай эканомікі, акрамя таго, вырашае пытанні занятасці. Але калі ты прыйшоў на дзяржслужбу і думаеш, што адразу станеш начальнікам і будзеш атрымліваць нейкія прывілеі, — не. Гэта работа вельмі сур'ёзная. І гэтай справе трэба аддаваць усяго сябе.

### Аляксандр Лук'янаў: «Важна адчуваць, чым жыве моладзь»

Як адзначыў **першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ**, дыялогавая пляцоўка стала важным мерапрыемствам з пункту гледжання кансалідацыі моладзі вакол важных ініцыятыў.

— Сёння БРСМ у цесным узаемадзеянні з Маладзёжным саветам, Нацыянальным сходам з'яўляецца адным з каардынатараў такой дзейнасці ў рэгіёнах. Мы знаходзімся на важным этапе фарміравання складу дэлегатаў на Усебеларускі народны сход і мусім разумець, адчуваць моладзь. Вядома, адной з найважнейшых задач з'яўляецца праз праграмную дзейнасць, стваральную працу, практычныя вынікі прыцягваць нашых рабят да палітычнага будаўніцтва нашай дзяржавы. І тут камунікацыя паміж Маладзёжным парламентам і БРСМ з'яўляецца надзейнай асновай, — выказаў меркаванне Аляксандр Лук'янаў.

Ён заўважыў, што сёння трэба вывучыць станоўчы вопыт работы маладзёжных лідараў з рэгіёнаў, пачуць пажаданні ад спікера Савета Рэспублікі. Атрыманыя ўстаноўкі і рашэнні неабходныя, каб і далей працягваць стваральную працу на карысць нашай краіны.

### Мікіта Рачылоўскі: «Моладзь з любога пункта краіны мусіць мець магчымасць рэалізаваць сябе»

**Старшыня Маладзёжнага парламента Мікіта РАЧЫЛОЎСКІ** падкрэсліў, што такія сустрэчы неабходныя, каб абмеркаваць актуальны вектар развіцця і тыя праблемы, якія ёсць у маладзёжным асяроддзі.

— І ў Маладзёжнага парламента, і ў БРСМ ёсць прадстаўніцтвы ў кожным раёне, але важна стараецца, каб яны працавалі разам, у звязцы з дэпутацкім корпусам, мясцовай уладай для таго, каб моладзь з любога пункта нашай краіны мела магчымасць рэалізаваць сябе, удзельнічаючы ў ажыццяўленні дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі, — адзначыў старшыня Маладзёжнага парламента.

Ён выказаў думку, што не павінна быць падзелу моладзі: прафсаюз, БРСМ, маладзёжны парламент ці «Белая Русь». Усе павінны працаваць дзеля нашай краіны. І незалежна ад таго, у якой арганізацыі знаходзіцца малады чалавек, ён мусіць прыносіць карысць.

**Алена КРАВЕЦ.**

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

# ВЫСЛУХАЦЬ,

## На прыём да сенатараў

**Работа са зваротамі грамадзян — важная справа ў дзейнасці сенатараў. На месцах людзі прыходзяць на прыём да членаў Савета Рэспублікі нярэдка як у апошнюю інстанцыю, з надзеяй, што ім абавязкова дапамогуць. І яны, сенатары, стараюцца дапамагаць. У праблемах тыповых (як правіла, яны датычацца сферы ЖКГ, дарог, добраўпарадкавання), так і нетыповых, а часам і вельмі асабістых. Вось пра гэтыя, нетыповыя, праблемы, да вырашэння якіх давялося спрычыніцца, якія асабліва запомніліся або ўразілі, мы і папрасілі расказаць членаў Савета Рэспублікі па выніках прыёмаў грамадзян у рэгёнах.**

### «Выйсце заўсёды ёсць»

**Алена ЗЯБЛІКАВА, член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Савета Рэспублікі, старшыня Барысаўскага раённага аб'яднання прафсаюзаў:**



Фота edinstvo.by.

— Аднойчы на прыём прыйшла маладая дзяўчына, якая мае статус сіраты. Да таго ж яна чакала дзіця. Так здарылася, што засталася без жылля, без сродкаў да існавання, без работы. Не ведае, як далей жыць, як утрымліваць немаўля, якое з'явіцца на свет. Вядома, мы вельмі дэталёва ўніклі ў гэтую сітуацыю. І з улікам нашага заканадаўства ўдалося ёй дапамагчы. Я сёння вельмі рада. Яна шчаслівая, мае жыллё, у яе выдатная дзяўчынка. Вы ведаеце, ад такіх сітуацый, калі атрымліваецца зрабіць сапраўды добрую справу, становіцца радасна на душы. Вельмі важна, што ў гэтай дзяўчыны засталося разуменне таго, што ёсць на свеце справядлівасць; што людзі, якія яе атачаюць, неабыякавыя да яе праблем.

Нядаўна па дапамогу звярнуўся хлопец. Яго маці вядзе асацыяльны лад жыцця, злоўжывае алкаголем, нідзе не працуе і не думае станавіцца на шлях выпраўлення. Ён з ёю не падтрымлівае ніякіх кантактаў, але вымушаны жыць пад адным дахам. У свой час жанчыну пазбавілі бацькоўскіх правоў, а сына змясцілі ў дзіцячы дом, дзе ён вырас, закончыў школу. Увесь гэты час, пакуль сын выхоўваўся ў сацыяльнай установе, маці не плаціла за кватэру і за камунальныя паслугі. У выніку ўтварыўся вялікі доўг, які ён не ў стане пагасіць. Палова жылплошчы належыць сыну, ён там прапісаны. Атрымліваецца, што заўнік павінен аплаціць доўг замест маці, з якой няма чаго ўзяць. Мы растлумачылі хлопцу, што гэтае пытанне не ў нашай кампетэнцыі, і параілі звярнуцца ў суд, дапамаглі яму з афармленнем іску, аказваем садзейнічанне, чым толькі можам. Справа яшчэ не завершана. Але спадзяёмся, што ўсё будзе добра.

З практыкі магу сказаць, што людзі вельмі часта звяртаюцца з просьбай вырашыць пытанне так, як яны тое бачаць і хочуць. Але мы заўсёды выразна і ясна выказваем сваю пазіцыю: толькі закон!

Радуе, што значная частка зваротаў грамадзян, звязаных з парушэннем іх законных правоў і інтарэсаў, — разгледжана станоўча. Большасць праблемных пытанняў вырашалася ў пазасудовым парадку, пасля перагавораў са спецыялістамі і кіраўнікамі прадпрыемстваў.

### «Пляцоўку рабілі талакой»



Фота «Наваполацк сёння».

**Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, старшыня Наваполацкага гарвыканкама:**

— Летась да мяне на прамую тэлефонную лінію звярнулася жанчына з Наваполацка. Маладыя бацькі з дамоў 16—24 па вуліцы Коласа калектыўна папрасілі дапамогі ва ўстаноўцы горкі для маленькіх дзяцей. Раён гэты густанаселены, дзе пражывае шмат сем'яў. Прамая лінія праходзіла 15 чэрвеня, а ўжо 3 жніўня мы разам з навапалачанамі адзначалі свята двара і адкрывалі не толькі горку, а цэлы шматфункцыянальны гульнявы комплекс.

Прыемна, што на маю прапанову паўдзельнічаць у добраўпарадкаванні дзіцячай зоны актыўна адгукнуліся і самі жыхары найбліжэйшых дамоў. Яны звязаліся са ЖРЭА, дамовіліся і ўстанавілі слупкі для будучай пляцоўкі. Аўтарам комплексу выступіла Наваполацкае камунальна-унітарнае прадпрыемства «Жыллёва-рамонтная эксплуатацыйная арганізацыя», а мару ўсіх малых мікрараёна — горку — увасобіла ААТ «ПраектКанцэпт ПРО». Паводле шчырых ацэнак першых выпрабавальнікаў канструкцыі і іх бацькоў, яна пераўзышла ўсе чаканні — асабліва прыйшлося даспадобы дзецям люстраное дно. У першыя дні функцыянавання комплексу чарга на галоўны яе аб'ект была па шэсць-сем чалавек, і сёння інтарэс да новай каляровай пляцоўкі не зніжаецца. Яшчэ адна добрая агульная справа на карысць горада і яе маленькіх насельнікаў зроблена, а падзяка за яе — шчырыя дзіцячыя ўсмешкі — з'яўляецца для нас, дарослых, самай галоўнай каштоўнасцю.

Нядаўна актыў Парламента дзяцей і навучэнскай моладзі ў Наваполацку выказаў прапанову ўладкаваць у горадзе скейт-пляцоўку. Дарослае пакаленне, вядома, такіх забавак не ведала і патрэбы ў спецыяльна адведзеных месцах не было. Аднак час не стаіць на месцы, з кожным днём з'яўляюцца новыя сродкі перамяшчэння. Ідэя аказалася вельмі цікавай і патрэбнай, бо дагэтуль у горадзе не было такой пляцоўкі для арганізацыі вольнага часу моладзі.

Мы разам з адказнымі службамі прапрацавалі дадзенае пытанне з улікам сучасных патрабаванняў да збудавання і захавання нормаў бяспекі. Для рэалізацыі праекта спатрэбіліся значныя фінансавыя ўкладанні — каля 500 тысяч рублёў, але сродкі мы знайшлі, да гэтага падключыліся прадпрыемствы і арганізацыі горада. Актыўна адгукнулася на прапанову акцыянерная таварыства «Нафтан», кіраўніцтва якога ўзяло на сябе закупку абсталявання і яго ўстаноўку.

Не засталіся ўбаку ад агульнай справы гараджане: талакой выйшлі на гарадскі суботнік, частка заробленых сродкаў з яго была накіравана на набыццё самой скейт-пляцоўкі. Жыхары актыўна бяруць удзел у добраўпарадкаванні будучага комплексу, а адкрыццё новага аб'екта інфраструктуры адбудзецца ўжо ў наступным месяцы падчас святкавання Дня горада.

# ПАРАІЦЬ, ДАПАМАГЧЫ...

## людзі звяртаюцца не толькі з пытаннямі ЖКГ

## «Людзі проста падыходзяць на вуліцы і просяць аб дапамозе»

**Андрэй ШЫШКІН, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, галоўны рэдактар Рагачоўскай раённай газеты «Свабоднае слова»:**

— У Рагачове, калі іду па рабочых справах па вуліцы, бывае, што людзі проста падыходзяць і просяць аб дапамозе альбо зважаюць на нейкую праблему, якая іх хвалюе. Да таго ж рэдакцыя нашай газеты знаходзіцца ў Рагачове каля аўтавакзала. Вяскоўцы, калі прыязджаюць у райцэнтр і ім неабходная дапамога, заходзяць і пакідаюць свае звароты. Іх тэматыка вельмі разнастайная. Звяртаюцца людзі і з простымі жыццёвымі, бытавымі пытаннямі. Напрыклад, у перыяд уключэння ацяплення ў шматпавярховых дамах Рагачова, позна вечарам мне паступіў званок ад жыхара райцэнтра, які паскардзіўся на халодныя батарэі ў яго кватэры. Мой званок асабіста дырэктару камунальнага жыллёва-эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства «Рагачоў» дапамог аператыўна вырашыць праблему. Адзін са зваротаў паступіў ад жыхаркі Рагачова. Жанчына была вельмі заклапочаная тым, што ў яе доме па вуліцы Багатырова адрамантавалі, але нікак не запускалі ў эксплуатацыю ліфт. У дадзеным выпадку, як і пры звароце пра ацяпленне ў кватэры, гэтая праблема была аператыўна вырашана. Заяўнікі звязваліся зноў — ужо каб падзякаваць за дапамогу.

Апошнім часам паступае шмат зваротаў, звязаных са сферай жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта ў тым ліку і сігналы аб неабходнасці рамонту праезнай часткі дарог, вуліц, дваровых тэрыторый. Між тым, каб вырашыць хвалюючыя праблемы добраўпарадкавання тэрыторый, многія мясцовыя жыхары праяўляюць і ўласныя ініцыятывы. Бывае, што звяртаюцца з імі адзінокія пенсіянеры, людзі з інваліднасцю, якія імкнуцца, каб каля іх дома, двара таксама было прыгожа, дагледжана, але з аб'ектыўных прычын яны самастойна не могуць дагледзець сваю прысядзібную тэрыторыю.



Фота з архіва Андрэя ШЫШКІНА.

У маёй практыцы са зваротамі быў выпадак, калі адзінокі хворы пенсіянер звярнуўся і шчыра прызнаўся, што не можа сам добраўпарадкаваць тэрыторыю каля свайго дома. Я звярнуўся зноў-такі да камунальнікаў, і супрацоўнікі пайшлі насустрач, дапамаглі з пакосам травы каля домаўладання пенсіянера.

У любым выпадку трэба тлумачыць і дапамагаць, не пакідаць чалавека сам-насам з пытаннем, якое яго хвалюе. На жаль, не ўсіх заяўнікаў задавальняюць адказы на іх звароты. Асабліва калі гэта датычыцца так званых прафесійных скаржнікаў. Яны атрымліваюць адказы не ў адной інстанцыі, ды ўсё дарэмна. Але і ад такіх людзей адмахвацца нельга, трэба зноў і зноў тлумачыць ім магчымыя варыянты вырашэння ўзнятага імі пытання ў рамках прававога поля.

## «Давялося звяртацца да Прэзідэнта»



**Дзмітрый ВАРАНЮК, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, кіраўнік прэс-цэнтра Дома прэсы:**

— Неяк праводзіў у Магілёве прыём у грамадскай прыёмнай ад арганізацыі «Белая Русь». Па дапамогу звярнуліся магіляўчане з «маласямейкі» па Пушкінскім праспекце. У іх склалася праблема з прыватызацыяй. Складанасць была ў тым, што тыя памяшканні, якія хацелі прыватызаваць жыхары, не падыходзілі пад статус кватэр. Каб вырашыць праблему, прыйшлося звярнуцца да Прэзідэнта. І кіраўнік дзяржавы даў такі дазвол. Аргументам стала тое, што людзі жылі там доўгі час, і пазбаўляць іх гэтага жылля было б несправядліва. На ўрэгуляванне пытання сышло прыкладна 1,5 года — вялася перапіска, рыхтаваліся дакументы, праектна-каштарысная дакументацыя.

Няпростай аказалася і сітуацыя з нерухомасцю, на якую паскардзілася яшчэ адна заяўніца. У 1990-я гады яна атрымала кватэру ад прадпрыемства, але «метраў» не хапала, і сям'і прапанавалі яшчэ і калясачную. Жанчына заключыла з кіраўніцтвам прадпрыемства дагавор на права карыстацца гэтым памяшканнем, зрабіла там рамонт і жыла дагэтуль. Летась яна вырашыла размяняць кватэру, і атрымалася, што па дакументах калясачная абмену не падлягае. Дагавор, які рабатадавец заключыў з магіляўчанкай у 1990-я, сёння не дзейнічае, бо не адпавядае заканадаўству. Атрымліваецца, што на гэтыя метры яна законнага права не мае. Куды яна толькі ні звярталася, але пытанне вырашыць не атрымалася. У выніку прыйшла на прыём да сенатара. Каб усю тую нерухомасць неяк аб'яднаць, мы ў індывідуальным парадку распрацавалі з Магілёўскім гарвыканкамам і Агенцтвам нерухомасці механізм. Жанчына напісала зварот у суд, і верагоднасць, што пытанне будзе вырашана на яе карысць, высокая.

А яшчэ мы папярэджваем спробы ўцягнуць моладзь у супрацьзаконныя дзеянні. Часам атрымліваем ад насельніцтва сігналы, што на сценах дамоў напісаны падазроныя кантакты з прапановай хуткага заробку. На самай справе такія «работадаўцы» ставяць далёка не альтруістычныя мэты, якія тояць у сабе небяспеку для моладзі. І мы звязваемся з камунальнікамі, каб яны зафарбавалі гэтыя аб'явы. Асноўная ж маса зваротаў звязаная з вырашэннем нейкіх бытавых пытанняў: паставіць лавачку, адрамантаваць дарогу і таму падобнае. З агульнай масы толькі каля 20 працэнтаў — сапраўды складаныя праблемы, для вырашэння якіх патрэбны час.

## «Дапамажы сябру» — гэта па-людску

**Ірына САЧКОЎСКАЯ, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, загадчыца натарыяльнай канторы Пінска:**

— Некаторыя праблемы, якія ўзнімаюць грамадзяне на прыёмах, патрабуюць пошуку спосабаў іх вырашэння з прыцягненнем органаў мясцовай улады альбо грамадскасці. Менавіта грамадскасць можа дапамагчы ў добрай справе, якую ўзначаліла пінчанка Таццяна Шуман. Таццяна Мікалаеўна прыходзіла на адзін з апошніх прыёмаў. Яна займаецца работай з бяздомнымі жывёламі.

Дарэчы, Пінск — адзін з нямногіх гарадоў, у якім забаронена эўтаназія бяздомных жывёл. Але ж усімі пытаннямі прытулку, адкрытага на базе ЖКГ, дзе размяшчаюцца былыя бадзяжныя каты і сабакі, займаецца група энтузіястаў-валанцёраў на чале з Таццянай Шуман.

Вядома, сіл і сродкаў патрэбна шмат, каб карміць, лячыць, праводзіць аперацыі па стэрылізацыі жывёл. Таму Таццяна Мікалаеўна стукае ва ўсе дзверы з просьбай аб дапамозе. Пасля прыёму я накіравала некалькі пісьмаў на прадпрыемствы і арганізацыі з просьбай дапамагчы матэрыяльна. Але ж ім патрэбна не толькі грашовая дапамога, але і маральная падтрымка — рэклама добрай справы, фарміраванне грамадскай думкі, прыцягненне валанцёраў.



На прыёме грамадзян побач з Ірынай САЧКОЎСКАЙ — Ганна ЛАЗОЎСКАЯ.

Да справы падключылася і **Ганна ЛАЗОЎСКАЯ, старшыня Маладзёжнага парламента пры Пінскім гарсавеце**, студэнтка чацвёртага курса біятэхналагічнага факультэта Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта — яна ўжо паўгода ўдзельнічае ў прыёмах грамадзян, якія праводзіць Ірына Юльянаўна. Расказвае Ганна Лазоўская:

— На ўсіх факультэтах нашага ўніверсітэта мы правялі дабрачынныя кірмашы пад дэвізам «Дапамажы сябру». Студэнты выпякалі пячэнне, іншыя прысмакі, рабілі сваімі рукамі сувеніры, потым прадавалі іх на дабрачынным кірмашы. Цану за прадукцыю часта не ўстанаўлівалі, пакупнікі рабілі пасільны ўнёсак. Такім чынам за штуку пячэння нярэдка давалі два, тры, а то і пяць рублёў. Падчас кірмашоў удалося сабраць пэўную суму на патрэбы прытулку. Варта сказаць, што ў нас развіты валанцёрскі рух, некалькі студэнтаў ужо даволі працяглы час працуе па названай ініцыятыве, а пасля кірмашу, спадзяюся, такіх стане больш.

Ірына Сачкоўская падкрэсліла, што падобныя мерапрыемствы становяцца не толькі спосабам збору сродкаў, але і прапагандай гуманнага стаўлення да жывёл:

— Гэта вельмі важна, бо дапамога бяздомнаму чатырохногаму сябру здольная абудзіць, асабліва ў дзіцячай душы, спагаду, дабрыню, гатоўнасць падтрымаць. Таму важна гутаркі на тэму адносін да жывёл праводзіць у школах, нават у дзіцячых садках. Як вядома, бадзяжныя жывёлы становяцца вынікам безадказнага стаўлення суайчыннікаў да хатніх гадаванцаў. Цяпер буду рабіць адпаведны акцэнт пры наведванні ўстаноў адукацыі. Да апошняга падштурхнула сустрэча на прыёме грамадзян.

**Матэрыялы падрыхтавалі Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Святлана ЯСКЕВІЧ, Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# КАЛІ ПАКУПНІКА ВЕДАЦЬ У ТВАР

## Чалавекам года Брэстчыны стала вясковы прадавец



**Нядаўна на Брэстчыне прайшла ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання работнікаў, удастоеных ганаровага звання «Чалавек года Брэстчыны». У шэрагу тых, каго ўшаноўвалі гэтым разам, была Людміла Васілеўская, прадавец крамы «Родны кут» з Відамлі Камянецкага раёна.**

Відамля знаходзіцца на скрыжаванні дарог, якія вядуць у Брэст, Гродна, Белавежскую пушчу. Тут вельмі ажыўлены рух, бывае шмат транзітных падарожнікаў. Аграгарадок вядомы сваім арыгінальным добраўпарадкаваннем, мностваам зеляніны і кветак. Відамля таксама — адзін з лідараў у раёне ў плане культуры і сацыяльнага развіцця. «Крама ў такой вёсцы проста мусіць адпавядаць усім крытэрыям сучаснага гандлёвага аб'екта», — усміхаецца яго загадчыца Людміла Васілеўская.

Людміла сваю работу любіць. У гандлі працуе ўжо 17 гадоў. Як толькі выйшла замуж за хлопца з суседняй вёскі і маладая сям'я купіла дом у Відамлі, яна ўладкавалася на працу ў мясцовую краму. Пачынала з прыбіральшчыцы, але старанную дзяўчыну заўважылі і хутка зрабілі прадаўцом. Работа ў яе руках заўсёды гарэла, неўзабаве яна дарасла да загадчыцы. А крама пад яе кіраўніцтвам стала набіраць гандлёвыя абароты.

— Вядома, з правядзеннем мадэрнізацыі адкрыліся новыя магчымасці, — разважае Людміла Філімонаўна. — Крама знешне стала больш прывабнай і сучаснай. Абноўлены фасад, праведзена добраўпарадкаванне тэрыторыі. Павялічана плошча паркоўкі, што вельмі выгадна з пункту гледжання прыцягнення транзітных пакупнікоў. Тут жа спыняецца мноства турыстаў, гасцей. Калі ёсць дзе прыпаркавацца, чалавек з задавальненнем зазірне ў краму, а калі зойдзе, то, хутчэй за ўсё, нешта купіць. Такіх пакупнікоў мы стараемся прывабіць мясцовай прадукцыяй: напрыклад, кексы Камянецкага хлебазавода альбо пельмені рэстарана «Белая вежа» апошнім часам становяцца лідарамі продажаў.

Прамысловая група таксама даволі шырокая, у нас можна купіць усё: ад зубной шчоткі да цэменту і іншых будаўнічых матэрыялаў. Адным словам, за апошнія гады сярэднямесячны тавараабарот павялічыўся ўдвая, сёння ён складае 120 тысяч рублёў. Крама працуе з 8 да 22 гадзін. Калектыў складаецца з сямі чалавек.

— Сапраўды, мадэрнізацыя гандлёвага аб'екта, узведзенага ў 1966 годзе, стала не проста новай прыступкай у развіцці, алеператварыла былую сельскую краму ў краму гарадскога фармату, — гаворыць **старшыня Відамлянскага сельскага Савета Марына КАРАЛЮК.** — Але ж галоўная заслуга ў паспяховасці належыць калектыву і яго загадчыцы. Яны ўвесь час у пошуку новых форм аб слугоўвання. Напрыклад, у «Вайберы» стварылі групу пакупнікоў, дзе ўжо паўтары сотні ўдзельнікаў. Аб паступленні новага тавару людзей інфармуюць адразу. У Відамлі, дзе пражывае каля тысячы чалавек, даводзіцца чуць толькі добрыя водгукі пра работу крамы. Бо вельмі важна, калі цябе сустракаюць з усмешкай, да пакупніка ставяцца шчыра і добразычліва, — падсумавала кіраўнік мясцовай улады.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов: оборудование, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 22**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. (снижение 15 %) |
|---|---|---|
| 1 | Полуавтоматическая флексографская печатная просекательно-рилевочная машина. Модель BYKM-II 1200*1200, инв. номер 515Т | **80 070,00** |
| 2 | Полуавтоматическая флексографская печатная просекательно-рилевочная машина. Модель YKS-1225, инв. номер 323Т | **83 130,00** |
| 3 | Полуавтоматическая флексографская печатная просекательно-рилевочная машина. Модель YKS-1022, инв. номер 21Т | **77 826,00** |

**Задаток 10 % от начальной цены лота** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи:** 30 календарных дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение 15 календарных дней после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 11.03.2023 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 13.00 30.05.2023**.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 29.05.2023 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 212 24-63-12, +375 29 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебский картонажно-полиграфический комбинат «Покровский», Республика Беларусь, г. Витебск, ул. Покровская, 5, тел.: +375 (212) 665361, +375 (29) 5121943.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49794 площадью 803,9 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, наименование – ангар-склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Составные части и принадлежности: проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Кап. строение с инв. № 200/С-49795 площадью 49,6 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А/2, наименование – сторожевая, назначение – здание специализированное иного назначения. Составные части и принадлежности: два навеса, шесть складов, проезжая часть (участок 1, участок 2, участок 3, участок 4), пешеходная часть (участок 1, участок 2), площадка (участок 1, участок 2), ограждение, ворота, ворота. Объекты расположены на земельном участке с кадастровым № 240100000002000187 (право постоянного пользования) площадью 0,3992 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Покровская, 10А, целевое назначение – земельный участок для обслуживания ангар-склада и сторожевой. Назначение зем. участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов обрабатывающей промышленности. Сооружения благоустройства кап. строений с инв. № 200/С-49794, № 200/С-49795 являются общими сооружениями благоустройства земельного участка с кадастровым номером № 240100000002000187. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена:** 287 100,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 28 710,00 бел. руб.

**Обременение:** договоры аренды № 06-12/17 от 01.06.2021 сроком по 31.05.2023, № 06-12/13 от 21.08.2020 сроком по 20.08.2023.

**Дата, время и место проведения аукциона: 19.06.2023 в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 18.05.2023 с 08.30 по 16.06.2023 до 17.30. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901**.

**Условия аукциона:** Победитель аукциона (единственный участник аукциона, выразивший согласие на приобретение предмета аукциона по нач. цене, увеличенной на 5 %) обязан: в течение 10 раб. дней со дня проведения аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки на р/с, указанный в протоколе аукциона; заключить договор купли-продажи в течение 15 рабочих дней с даты утверждения протокола аукциона; оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета аукциона. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки по лоту № 1 – 1195,20 бел. руб. с учетом НДС.*

**Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609.** Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивид. предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивид. предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или русск. язык; представителем юр. лица РБ – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивид. предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на бел. или рус. язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Информация об окончательных суммах затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходах, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, письменно доводится до сведения участников до начала проведения аукциона. **Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-12, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by.** Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (29) 5121943, Курбанов Махач Нариманович.



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона/Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом.1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by

**Продавец:** ООО «РРЮ РИАЛ ПРОПЕРТИЗ», 220035, г. Минск, ул. Тимирязева, д. 74А, оф. 4

| Предмет электронного аукциона – торговое помещение | Начальная цена с НДС 20 %: 310 000 долл. США |
|---|---|
| (общей площадью 308.6 кв. м, инв. номер 500/D-70784765), расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 117А-9Т | (расчет в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату оплаты предмета аукциона) |

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях по курсу НБРБ на дату внесения платежа перечисляется на расчетный счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X. Получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191 224 638

| | |
|---|---|
| **Доп. информация** | **1. Аренда. Подробная информация на www.ipmtorgi.by 2. Ипотека у ЗАО «Альфа-Банк»** |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 19.06.2023 г. с 10.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.06.2023 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 29-317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by; info@ipmtorgi.by** |



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.441. Нумар падпісаны ў 19.30 16 мая 2023 года.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |
| **Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона)** | Извещение о проведении публичных электронных торгов опубликовано 21.03.2023 в газете «Звязда» № 53 (29933), стр. 10 |

**Первые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области**

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| **1** | **Электропогрузчик ЕВ-687-45-11, инв. № 9067, бывший в употреблении** | **1 836,00** | **1 224,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by, и на официальном сайте ООО «Индустрия Инноваций» www.iin.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

**Условия оплаты предмета торгов электронных торгов: не позднее 30 (тридцати) календарных дней** со дня проведения торгов. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенном по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить оператору торговой электронной площадки вознаграждение в размере **3 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 01.06.2023, начало торгов в 10.00, окончание торгов в 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются по 31.05.2023 г. до 16.00.** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «Логтипс»**

(УНП 191657647, г. Минск, ул. Гурского, д. 22Б, адм. пом. 216).

***Дата и время проведения торгов*: 31 мая 2023 года.**

Начало – 12.00. Заявки принимаются с 17 мая 2023 года по 26 мая 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «Логтипс»** (УНП 191657647) в лице ликвидатора – директора ООО «Консалтинговая группа «ПРАВО» Мамедовой В.О.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 63 (29943) за 04.04.2023

## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ЗАО «Эрмес – Маркет»**

(УНП 190485521, г. Минск, ул. Захарова, д. 19, ком. 7а).

***Дата и время проведения торгов*: 30 мая 2023 года.**

Начало – 12.00. Заявки принимаются с 17 мая 2023 года по 26 мая 2023 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 23, каб. 23-5), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ЗАО «Эрмес – Маркет»** (УНП 190485521) в лице ликвидатора – директора ООО «Консалтинговая группа «ПРАВО» Мамедовой В.О.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 2 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте http://www.specrealization.by.

Контактный телефон для осмотра лота в рабочее время (с 9.00 до 17.00) +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 64 (29944) за 05.04.2023

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ПО ОБЪЕКТУ СТРОИТЕЛЬСТВА

### «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Первая очередь строительства. Жилой дом № 2 по ГП. Многоуровневая гараж-стоянка № 3.1 по ГП

**Информация о застройщике**

Государственное производственное объединение «Минскстрой» (далее – ГПО «Минскстрой») 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 13а;
режим работы: пн.-чт. – 8.30 до 17.45, пт. – 8.30 до 16.30, перерыв 13.00-14.00;
тел.: +375 17 327-52-36, +375 17 226-03-01; +375 29 195 18 21; +375 29 139-14-82, +375 29 139-14-72.

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 18 января 2007 г. № 140 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 100071325.

**Сведения о жилых домах, в строительстве которых, выполняя функции заказчика, принимал участие застройщик в течение 3 лет, предшествующих опубликованию настоящей проектной декларации, с указанием фактических сроков – строительства:**

- жилой дом № 12 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: ноябрь 2019 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 14 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: февраль 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 16 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – январь 2021г.;
- жилой дом № 18 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: декабрь 2019 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 24 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: февраль 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 28 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 30 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: март 2020 г. – январь 2021 г.;
- жилой дом № 32 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: апрель 2020 г. – июнь 2021 г.;
- жилой дом № 46 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: октябрь 2021 г. – октябрь 2022 г.
- жилой дом № 38 по ул. Корзюки, фактические сроки строительства: октябрь 2021 г. – октябрь 2022 г.;
- жилой дом № 115 по ул. Притыцкого, фактические сроки строительства: октябрь 2020 г. – сентябрь 2022 г.

**Информация об объекте строительства**

В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 03.11.2021 № 431-дсп «О реализации инвестиционного проекта» ГПО «Минскстрой» осуществляет строительство в составе объекта «Комплекс жилой застройки «Уютный». Группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда». Первая очередь строительства. Жилой дом № 2 по ГП. Многоуровневая гараж-стоянка № 3.1 по ГП.

**Сведения о месте нахождения объекта строительства**

Земельный участок для строительства расположен в Партизанском районе г. Минска, границами участка являются: с севера – улица Подлесная; с западной и южной стороны – зеленый массив; с восточной стороны – частная жилая застройка.

**Строительство осуществляется на основании**

- решения Минского городского исполнительного комитета от 13.04.2023 № 1372 «О разрешении строительства объекта»;
- экспертного заключения РУП «Главгосстройэкспертиза» от 23.03.2023 № 76-15/23 (положительное);

**Гараж-стоянка** запроектирован на 408 машино-мест, наземный, открытого типа, 5-, 6-этажным с размещением автомобилей на 5 уровнях и эксплуатируемой кровле. Для сообщения между этажами и эксплуатируемой кровлей предусмотрен лифт и две лестничные клетки, тротуары вдоль рамп. На каждом этаже и эксплуатируемой кровле предусмотрено размещение машино-мест размерами 2,5х5,0м. На 1-м этаже расположены машино-места, электрощитовая, помещения хранения велосипедов, помещения уборочного инвентаря, зарядные станции для автомобилей. Для предотвращения повреждения строительных конструкций, машино-места обеспечены колесоотбойниками.

*Наружная и внутренняя отделка*

Стены – покраска фасадной краской, покраска акриловой краской; покрытие пола – бетонная плитка, бетонное с упрочнением (в местах хранения автомобилей), керамическая плитка (в лестничных клетках, в помещениях электрощитовой, помещении хранения велосипедов).

Металлические ограждения – покраска эмалью.

Договорами создания объектов долевого строительства предусмотрено строительство жилого помещения (квартиры) и машино-места в составе объекта строительства.

Для заключения договоров создания объектов долевого строительства на дату опубликования декларации по объекту предлагается **30 (тридцать) квартир** с учетом приобретения машино-места в гараже-стоянке № 3.1 по генплану в составе объекта строительства, в том числе:

**- 7 (семь) однокомнатных квартир:**
- № 223 (общая площадь 39,89 кв. м),
- № 228 (общая площадь 37,09 кв. м),
- № 232 (общая площадь 45,01 кв. м),
- № 233 (общая площадь 37,09 кв. м);
- № 292 (общая площадь 40,09 кв. м);
- № 297, № 302 (общая площадь 37,08 кв. м каждая);

**- 15 (пятнадцать) двухкомнатных квартир:**
- № 224, № 229 (общая площадь 63,98 кв. м каждая),
- № 225, № 230, № 235 (общая площадь 62,41 кв. м каждая),
- № 234 (общая площадь 66,29 кв. м);
- № 290, № 295, № 300 (общая площадь 62,4 кв. м каждая);
- № 293, № 298 (общая площадь 68,70 кв. м каждая);
- № 291, № 296, № 301 (общая площадь 63,94 кв. м каждая).
- № 303 (общая площадь 64,77 кв. м);

**- 8 (восемь) трехкомнатных квартир:**
- № 221, № 226 (общая площадь 81,22 кв. м каждая);
- № 231, № 236 (общая площадь 81,31 кв. м каждая);
- № 294, № 299, № 304, № 309 (общая площадь 83,32 кв. м каждая).

Количество реализуемых машино-мест, находящихся на 1-4 уровнях, в гараже-стоянке № 3.1 по генплану по настоящей проектной декларации составляет 30 машино-мест.

Цены на объекты долевого строительства:

Стоимость строительства 1 квадратного метра общей площади объектов долевого строительства без выполнения внутренних отделочных работ в текущих ценах составляет:

| Стоимость строительства 1 кв. м жилых помещений и машино-места | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Этаж | Площадь жилого помещения (квартиры), кв. м | | Стоимость 1 кв. м при 100 % оплате, бел. руб. | Стоимость 1 кв. м при рассрочке платежей, бел. руб. | Стоимость 1 кв. м при условии кредитования в рамках партнерской кредитной программы от ОАО «АСБ Беларусбанк», бел. руб. | Стоимость 1 кв. м машино-места, бел. руб. |
| 2-4 | 1-комнатные | 37,08–45,01 | 3 900,00 | 3 950,00 | 4 062,00 | 1 595,68 |
| 2-4 | 2-комнатные | 62,4-66,29 | 3 500,00 | 3 550,00 | 3 646,00 | |
| 2-5 | 3-комнатные | 81,22-83,32 | 3 300,00 | 3 350,00 | 3 437,00 | |

- свидетельство (удостоверение) № 500/1822-8601, о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права пользования на него от 24.01.2023, площадью 3,647 га (группа многоквартирных многоэтажных жилых домов в районе улиц Подлесной – Парниковой – Дачного проезда);
- договора строительного подряда на строительство объекта от 28.04.2023 № 281с-03-23, заключенного с ОАО «Стройтрест № 1»;
- извещения о получении уведомления и регистрации объекта строительства инспекцией Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 2 мая 2023 г. под № 2-205Ж-012/23.

**Цель строительства**

Объекты долевого строительства строятся для личных нужд дольщиков.

**Сведения об этапах строительства и сроках его реализации**

Срок начала строительства объекта – 29 апреля 2023 года.

Нормативная продолжительность строительства объекта 18 месяцев.

Планируемый срок завершения застройщиком строительства объекта и ввода в эксплуатацию в соответствии с проектной документацией – 28 октября 2024 года.

**Жилой дом** запроектирован 6-секционным, переменной этажности, 14-16-этажным, на 354 квартиры с подземным этажом, техническим чердаком, кровлей плоской, двухслойной из битумно-полимерных кровельных материалов с внутренним водостоком. Конфигурация в плане – «Г»-образная. Конструктивная схема здания – рамно-связевый каркас с плоскими перекрытиями. В подземном этаже расположены: кладовые жильцов (не в составе общедомового имущества), электрощитовая, водомерный узел, технические помещения. На первом этаже расположены: помещения входных групп, зоны хранения колясок, 1-, 2-, 3-, 4-комнатные квартиры. В квартирах выполнена планировка с совмещением жилой комнаты и кухни, перегородками выделены прихожие, санузлы, организованы летние помещения (лоджии, балконы). Мусоропровод проектом не предусмотрен.

Наружные стены надземной части здания запроектированы из блоков керамзитобетона, монолитного железобетона (часть) со сплошным утеплением минераловатными плитами. Внутренние стены – монолитные железобетонные. Перегородки межквартирные – из двух рядов блоков керамзитобетона с заполнением минераловатными плитами, перегородки межкомнатные – из полнотелых керамзитобетонных блоков, перегородки санузлов – кирпичные.

Окна: деревянный профиль, заполнение – 2-камерные стеклопакеты, оборудованы детскими замками безопасности и вентклапанами; неоткрывающаяся нижняя часть оконных блоков с пониженной подоконной частью высотой 1,1 м от пола предусмотрена с заполнением многослойным безопасным стеклом.

Двери: стальные, деревянные.

Элементы остекления лоджий: алюминиевый профиль, неоткрывающаяся нижняя часть оконных блоков с пониженной подоконной частью высотой 1,1 м от пола предусмотрена с заполнением многослойным безопасным стеклом.

*Наружная отделка*

Стены: защитно-отделочное покрытие по легкой штукатурной системе утепления, вентфасад (участки фасадов).

Металлические элементы: полимерное покрытие.

*Внутренняя отделка*

В квартирах предусмотрена подготовка поверхностей под финишную отделку.

В местах общего пользования: стены – декоративная штукатурка с акриловой покраской; потолки – акриловая покраска; покрытие пола – керамогранитная плитка.

Технические помещения: стены, потолки – акриловая покраска; покрытие пола – керамическая плитка.

*Отопление*

Источником теплоснабжения жилого дома являются отопительные электрокотлы, установленные в санузлах или коридорах в каждой квартире. Для электрообогрева квартир предусмотрены самостоятельные вводы и отдельные вводно-распределительные устройства. Каждый котел имеет встроенную систему автоматики. В качестве нагревательных приборов приняты стальные панельные радиаторы.

**Условия оплаты:**

при 100 % оплате жилого помещения и машино-места оплата должна быть произведена в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при условии оплаты согласно графику платежей к договору создания объекта долевого строительства по жилому помещению и машино-месту первоначальный взнос составляет 30 % от стоимости объекта долевого строительства. Оставшаяся сумма по договору оплачивается ежемесячно равными долями в соответствии с графиком платежей к договору. Оплата первоначального взноса должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме;

при кредитовании в рамках партнерской кредитной программы финансирования строительства размер оплаты по жилому помещению составляет 100 % от стоимости жилого помещения. Оплата должна быть произведена дольщиком в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме.

**Сведения о составе общего имущества многоквартирного жилого дома и гаража-стоянки, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию жилого дома, гаража-стоянки и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**

- в состав общего имущества жилого дома входят: электрощитовая, водомерный узел, помещение приборов сигнализации, помещение связи, межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыша, чердак, и другие места общественного пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, а также элементы благоустройства и озеленения территории;
- в состав общего имущества гаража-стоянки входят строительные конструкции гаража-стоянки и защитные ограждения, проезды общего пользования, лестницы, кровля и другие места общего пользования, механическое, лифтовое оборудование, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри гаража-стоянки, элементы благоустройства и озеленения территории.

**Условия ознакомления с объектами долевого строительства и ходом работ по ним:** ознакомиться можно в офисе застройщика ГПО «Минскстрой».

Заявления о заключении договоров будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней в порядке живой очереди. Договоры создания объектов долевого строительства будут заключаться после получения уведомления от ГПО «Минскстрой» (по средствам телефонной связи, сообщения в Viber, Telegram), но не ранее 7 (семи) календарных дней после опубликования настоящей декларации по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13а, каб. 105 с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Для подачи заявления и заключения договора необходимо наличие:

для физических лиц – паспорта, доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;

для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: документа, подтверждающего полномочия представителя, паспорт представителя, копии свидетельства о государственной регистрации и Устава.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве после уведомления не явился в течение 3 рабочих дней для заключения договора и письменно не сообщил об уважительных причинах своей неявки в Viber, Telegram, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленный объект долевого строительства с другим претендентом.

ГПО «Минскстрой» имеет право отказать в заключении договора создания объекта долевого строительства без объяснения причин.

Условия на оставшиеся задекларированные квартиры и машино-места действуют до опубликования новой декларации.



# «БЕДНЫ ЯНКА: У ДОМ ЦЯГАЕ

## ЎСЁ, ШТО ЖОНКА ЗАГАДАЕ...»

**Цар Саламон насіў пярсцёнак з суцяшальным: «Усё праходзіць...»**
**І сапраўды: усё — апроч жыцця, бо жыццё пралятае.**
**Такім чынам з яго, нашага мінулага: трыццатыя гады, ліквідацыя непісьменнасці. Маладому прыезджаму настаўніку даручаюць выступіць перад вяскоўцамі.**
**Ён, вядома ж, рыхтуецца і для знаёмства заяўляе: «Я — чалавек гуманны. Прагрэс — мая ідэя!»**
**Шэпт у першым радзе, паміж дзвюх бабуль: «Мань, а Мань, што ён сказаў?» — «Сказаў, што сядзеў у гумне, прагрыз страху і пытаецца: «Дзе я?»**

...Што яшчэ гаварыў той настаўнік сялянам, а сяляне, слухаючы яго, — адзін аднаму, нікто не запісаў — на жаль, бо цікава ж было б пачытаць, як і нашу рэдакцыйную пошту.

«Чарговы конкурсны здымак, — піша **спадар Цімошка з Валожыншчыны**, — напомніў мне стары анекдот. Адзін паляўнічы зайшоў у хату да другога, уважліва агледзеў рогі на сценах і кажа: «Файныя!.. Не прыдзяроўся! Але ў мяне большыя!» Гаспадар яму (памяркоўна): «Дык і жонка ў цябе старэйшая».

Трэба разумець, болей часу мела, каб мужу рогі настаўляць.

Што гэта значыць і чаму так людзі гавораць, — ёсць пытанне, як той казаў. А значыць, павінен быць і адказ? «Паводле адной версіі, выраз паходзіць са старажытнай Германіі, — піша **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. — Там, збіраючы, выпраўляючы мужоў на вайну, жонкі на галовы ім надзявалі шлемы з характэрнымі рагамі, што азначала адправіць чалавека ў паход, а самой застацца свабоднай... Паводле другой — паляўнічы Актэон пасмеў убачыць купанне багіні Дыяны, за што яна ператварыла хлопца ў аленя з вялізнымі рагамі. Паводле трэцяй...»

А хай сабе чацвёртай і... любой — анічога іншага там няма, бо раганосец і ёсць раганосец — падмануты муж. Трэба разумець, няшчасны? Ды як сказаць? **Сужэнцы Клімовічы з Мядзела** да аднаго такога ў госці схадзілі. Што ўбачылі? Чытайце:

*На верандзе ў Сярогі*
*Ўсюды рогі, рогі, рогі...*
*Распыталі, дзе ж ты ўзяў?*
*Гэтак многа!.. Як і ўлезла?*
*Той ды з форсам адказаў:*
*Жонка з горада прывезла!*

Трэба разумець, купіла? А зрэшты (паводле **спадарыні Валянціны Гудачковай з Жыткавіч**),

*Вабных многа маладзіц —*
*Нельга не заўважыць...*
*Рогі носяць іх мужы,*
*Дзе ўзялі, — не кажуць.*

Ёсць меркаванне, што асобныя — самі не ведаюць (ні таго, што носяць, ні таго, дзе ўзялі), але ж пра іх — пазней, цяпер — пра мужчынбурчуноў ды зануд, якія заўсёды і ўсім незадаволеныя, якія...

Навошта прозай, калі ёсць верш (пра сябе, не пра сябе?) — ад **спадара Мікалая Камароўскага з Оршы**:

*Чалавек я досыць строгі:*
*Навучаю ўсіх, як жыць...*
*Жонка лічыць, што бязрогі?*
*Значыць, трэба два купіць.*

Паўстае пытанне, дзе? Каб добрыя, каб танна? Падказка ад **спадарыні Міхайлоўскай з Узды**:

*Даць аб'яву у «раёнку»? —*
*Трэба грошы заплаціць...*
*Лепш на нейкую кардонку*
*Пару слоўцаў прыляпіць.*

Ці ў інтэрнэт абвестку закінуць.

Днямі там яшчэ адна цікавая мільганула — і таксама са здымкам. На ім — нехта падаконнік зняў, з вазонамі. У адным — шыкоўны дзьмухавец: жоўценькі, распушчаны... І подпіс пад ім: прадам рэдкую хрызантэму. Тых, хто ў іх не разбіраецца, прашу не званіць, не замінаць майму бізнесу.

Вось і тому «бязрогаму», што аб'яву даў, можна было б не перашкаджаць: хай купляе, што хоча, што яму трэба. Але ж як утрымацца, калі бачыш відавочнае (на думку **спадара Аляксандра Матошкі з Расоншчыны**):

*Ясь — да бізнесу не здатны:*
*Абы грошы марнаваць!*
*Рогі ж можна мець бясплатна,*
*Калі жонцы волю даць!*

Пра тое ж, але куды карацей, у **спадарыні Соф'і Кусянковай з Рагачоўшчыны**:

*Купляеш рогі? Ну й дзівак —*
*Бо ж нехта мае іх за так.*

**Спадарыня Тацццяна Шпакава з Магілёва** лічыць, што і гэтая купля, і абвесткі не па добрай волі, а якраз наадварот:

*Бедны Янка: у дом цягае*
*Ўсё, што жонка загадае —*
*Па хвасцец адбіў быў ногі:*
*Захацела Яня рогі.*

Да таго ж, на думку **спадарыні Любові Чыгрынавай з Мінска**, бясплатна, дарма (не блытаць з «дарэмна», як адна з чытачак: «Спадзяюся, што і надалей у нашай краіне будуць дарэмна вучыць, дарэмна лячыць». Што ў выніку? Раніца. Бальніца. У палату заходзіць доктар са словамі: «Ёсць тут хто жывы?»)

Зрэшты, мы крыху адхіліліся — ад рагоў, задарма. Паводле **спадарыні Чыгрынавай**:

*Жонка ў хаце галава:*
*Захацела рогі... Два.*
*Янка ў пушчы іх шукаў,*
*Цэлы водпуск змарнаваў:*
*Не губляў свае сахаты!*
*Муж цяпер і сам рагаты.*

Трэба разумець, пастараліся яго палавіна — купіла... Альбо сам, прычым — не падумаўшы... А зрабіць тое, як лічыць **спадар Мікалай Камароўскі**, не лішне было б:

*Што галава, то нейкі ж розум?*
*Дурному цяжка сёння жыць.*
*Вось, скажам, вы прыдбалі рогі,*
*А як жа з імі ў лес хадзіць?*

Без іх — хоць куды, згадзіцеся — і зручней, і болей толку. А ўжо ў лесе, у грыбах ды на паляванні... Пра яго — цэлая гісторыя (заўважце — у васьмі радках!) — ад **спадарыні Кусянковай**:

*На адстрэл лясных жывёл*
*Патрабуецца дазвол. Ясь сказаў:*
*«А мне пляваць,*
*Буду гэтак палявацъ!»*
*І хадзіў... Маскіраваўся!..*
*На рагах — такі папаўся!*
*І цяпер больш не палюе:*
*Недзе ў Комі лес пілуе.*

Незайздросныя заняткі: і адзін (браканьерствам займацца), і другі...

Байка пра абодва (чорны, але ж гумар).

Двое так званых новых ці крутых за сталом сышліся, перапілі ды сталі выхваляцца. Першы — пальцы веерам: я, маўляў, са сваімі хлопцамі, з аховай, падаўся на рыбалку. Шашлычок там, каньячок, потым закідваю вудачку і... Ёсць! Ледзь не адразу! Я давай цягнуць: і так, і вось так — вялізнае нешта: рады не дам! Клікнуў сваіх, семярых... Не паверыш: ледзьве дасталі! Асетр... Аж восем метраў!.. «Брэшаш, — не паверыў слухач. — Асятроў такіх не бывае». — «Язлавіў! Зуб даю!» — «Ну нетакога ж... Урэж!» — «Не магу: сам памераў!» — «Тады слухай сюды: «Паехаў я на паляванне — адзін. Вылез з машыны, па ўзлеску іду. Бачу — сахаты наперадзе. А зброя ж у мяне — ты ведаеш?! — як на падбор: калі б'е, то насмерць. Я ружжо да пляча, прыцэліўся — ба-бах! Лось з капытоў, што называецца... Я да яго: наблізіўся, аж бачу — з іншага боку... егер ідзе, а ў мяне дазволу няма на адстрэл жывёлы... Ну дык што было рабіць: яшчэ раз ба-бах!.. Яшчэ раз наблізіўся: стаю, гляджу — мазгі выкручваю, што ж далей? Ажно чую — з боку машыны дымком пацягнула. Трохі прайшоў — палатка, турысты... Здадуць — як піць даць, першымі сведкамі будуць... Я зноў ба-бах, ба-бах... Аддыхаўся, паглядзеў уверх — на ўзгорку «Ікарус». З пасажырамі... Слухай, браток, богам прашу: урэж свайго асятра! А то ўсіх палажу!»

Рыбаловы ды паляўнічыя, мусіць, і сапраўды самыя вялікія фантазёры?!

...З нябёсаў — на зямлю, з лесу — у... аўтобус. Там, аднойчы, — як піша **спадар Мікалай Старых з Гомеля**, — ехалі трое: мужчына з жонкай і насупраць іх — мужчына без жонкі, адзін.

Кіроўца раптам затармазіў... Першы пасажыр не ўтрымаўся і другому ў жывот галавой... Сказаў: «Выбачайце!», а пацярпелы хіба ўсміхнуўся ды... падзякаваў яго жонцы, што муж без рагоў — інакш мог бы параніць....

Сам я, — піша **спадар Мікалай**, — гэтага не бачыў-не чуў, а вось прыклад, калі муж аддаў сваю жонку саперніку, успомніў:

*Мой знаёмец-барадаты*
*Нейкі час хадзіў рагаты,*
*А затым за паўлітроўку*
*Уступіў суседу жонку,*
*Сам завёў яму дахаты:*
*Хай пабудзе й той сахатым.*

Што, дарэчы, і паводле **спадара Цімошкі**, зусім не факт:

*Ў жонкі спраў —*
*заўжды па вочы!*
*Падмагчы сужэнец хоча:*
*Каб ёй клопат меншы быў,*
*Рогі сам сабе купіў.*

Анекдот: муж, з'язджаючы ў санаторый, шкадуе жонку, просіць: «Ну ты ж тут не сумуй»... Праз нейкі час вяртаецца: каля пад'езда бабулькі сядзяць, кажуць: «А твая тут не сумавала...»

Адкуль цалкам лагічнае (ад **сужэнцаў Астроўскіх з Мінска**):

*Павялося так вякамі,*
*З чым мы цалкам згодныя:*
*Калі ходзіць муж з рагамі, —*
*Гэта, людцы, не сям'я.*

...Тады пра іншае: тэатр, як вядома, пачынаецца з вешалкі, — нагадвае **спадар Валерый Гаўрыш з Чавусаў**. І лічыць, што аўтара гэтай аб'явы:

*Усё даймаюць мінакі!*
*Таму ўсім тлумачу:*
*Рогі мне — на вешакі:*
*У доме прысабачу!*

Што будзе далей, ведае **спадарыня Гудачкова**:

*Зручна рогі мець у хаце!*
*Не адстань ад іншых, браце:*
*Шык — пры людзях, для парадку*
*На вяшак ускінуць шапку.*

Хоць яно і рызыкоўна, бо, папершае, можна прамахнуцца, а па-другое, на думку **спадарыні Чыгрынавай**, праславіцца рэтраградам, бо і сапраўды ж

*Капрызуля цётка-мода:*
*Куфры, сценкі ды камоды,*
*Кажухі, валёнкі, футры,*
*Шапкі з пыжыка і нутрый...*
*А «Мадонны», а крышталь...*
*Не ў пашане больш, на жаль.*
*Вось і рогі ўжо не ў модзе*
*Не купляйце болей, годзе!*

З дыялогаў. «Сусед, ты, кажуць, да маёй жонкі ходзіш. Нядобра гэта». — «А вас, Іванових, хіба разбярэш: жонка кажа, што добра, ты — што нядобра...»

Вось і ў поглядах на рогі згоды няма: **спадарыня Чыгрынава** піша, што яны без патрэбы ўжо, **спадар Эльяш Банель з Мінска** — якраз наадварот:

*Алкаголь здароўю шкодзіць?*
*Ды як вып'еш, — весялей.*
*Рогі, кажаце, не ў модзе,*
*Але ж з імі — нейк смялей!*

Ну сапраўды, можна ж калі-нікалі рогам упрецца і...

Надвое бабка варажыла: ці памрэ, ці будзе жыва, бо...

*Ёсць такія... Хай нямнога,*
*Што згубілі недзе страх:*
*Калі нейкі ўпрэцца рогам,*
*Біць патрэбна па рагах.*

З тога ж канверта, ад **сужэнцаў Астроўскіх**, яшчэ адна слушная заўвага:

*Гэту мудрасць чуў ад многіх,*
*Неадночы на вяку:*
*Не дай, божа, свінні рогі,*
*Не дай панства мужыку!*
*Бо*
*Трэ да лепшага імкнуцца,*
*Ды напышлівым не будзь,*
*Бо калегі разбяруцца,*
*Рогі хутка адаб'юць.*

Як гэта, ведае **спадар Валерый Гаўрыш**:

*Янка — быў начальнік строгі,*
*Нос кручком задраўся...*
*Абламалі з часам рогі —-*
*У ІП падаўся.*

Ну чаму б і не, калі (паводле **спадарыні Гудачковай**)

*Зноўку Бендэры з дарогі*
*Хочуць бізнес мець круты:*
*Тут, у нас, скупляйма рогі,*
*Потым — пойдуць капыты.*

Пра гэты ж, адзін з... чатырохсот параўнальна сумленных спосабаў адымання грошай, і **спадар Мікалай Касмачэўскі з Наваполацка**:

*Тэма тут — ні даць ні ўзяць:*
*Фірмы «Рогі з капытамі»*
*Падбіваюць, каб мы самі*
*Штосьць маглі купіць-прадаць.*
*Хто — кватэру з пераездам,*
*Хтосьці — два мяхі крупы...*
*І абляпваюць пад'езды*
*І абклейваюць слупы.*

Што ёсць, тое ёсць, на жаль. Як і безліч самых розных абвестак у інтэрнэце, па радыё, тэлебачанні, у грамадскім транспарце, у крамах, на вуліцах, у паштовых скрынках...

Што датычыцца кароткай і, як выглядае, базарнай, з апошняга конкурснага здымка, дык, відаць, мае рацыю **спадарыня Гудачкова**:

*Кажуць, з рога ўсяго многа...*
*Ну й скупляе іх Сярога,*
*Каб пажыць хоць трохі з шыкам...*
*Каб не выйшла тое пшыкам.*

Пра адзін з іх — **спадарыня Чыгрынава**:

*У сяле ці гарадку*
*Грэх без працы мужыку.*
*Справу ён сваю адкрыў,*
*Сувеніраў нарабіў...*
*Падлічыў выдаткі Глеб*
*Зарабіў хіба на хлеб.*

Як кажуць нашы суседзі, знаў бы прыкуп, жыў бы ў Сочы.

Аб тым, чаго не знаюць-не ведаюць, нашы чытачы, здаецца, не пішуць. Значыць, мы таксама не будзем. Тады — аб тым, што ведаем.

На папярэднім конкурсным здымку (гл. нумар «Звязды» за 15 сакавіка) быў трактар на заснежаным беразе, коламі ў вадзе.

Як ён трапіў у яе, здагадак было шмат. Найцікавейшыя, паводле вялікага чытацкага журы, даслалі **спадары Аляксандр Матошка з Расоншчыны і Валерый Гаўрыш з Чавусаў, спадарыні Валянціна Гудачкова з Жыткавіч і Соф'я Кусянкова з Рагачоўшчыны, сужэнцы Астроўскія з Мінска**.

З гэтым вось, апошнім, меркаваннем пагадзілася і журы маленькае рэдакцыйнае, а значыць, прыз у выглядзе падпіскі на дарагую сэрцам «Звязду» на трэці квартал бягучага года застаецца ў сталіцы.

Хочаце, каб родная газета на роднай мове пяць разоў на тыдзень прыходзіла да вас? Тады варыянтаў два: альбо афармляць падпіску (на месяц, на два, на квартал), альбо ўважліва паглядзець на чарговы конкурсны здымак (унізе), прыдумаць подпіс (можна некалькі, але дасціпных, кароткіх (не больш за восем радкоў) і даслаць у рэдакцыю. Шанц на выйгрыш мае кожны.

**Валянціна ДОЎНАР,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Іна Фралова — паэтка, празаік, перакладчыца. Выпускніца БДПУ імя М. Танка, Вышэйшых літаратурных курсаў Літаратурнага інстытута імя А. М. Горкага ў Маскве, аўтар кніг для дзяцей і дарослых, лаўрэатка літаратурных конкурсаў, у тым ліку міжнародных.*

*Гераіня апавядання, якое прапануецца чытачам «Звязды», магла б з поўным правам аднесці да сябе радок з верша Іны Фраловай: «Пашчасціла вясковай быць...» Калі сэрца ахоплівае адчуванне трывогі, Васіліна ляціць думкамі ў светлыя часы залатога дзяцінства, да родных людзей і вясковых заняткаў, прыроды, якую адчувае надзвычай тонка. І здрада тых, ад каго не чакала, не прыгінае дзяўчыну да зямлі, а вызваляе крылы для палёту, бо вясна ў росквіце, а наперадзе — цэлае жыццё.*

**Алена БРАВА.**



**Іна ФРАЛОВА**

# ВАСІЛЁЧКІ-КВЕТАЧКІ

МАЙСКАЯ ноч бушавала гукамі, пахамі, жаданнямі. Разам з пачуццямі нараджалася паэзія:

«Прачнуўся май!
Бэз ап'яняе пахам.
Прачнуўся май
У росквіце вясны!..»

Васіліне зрабілася душна ад бэзавага водару і гарачых слоў хлопца. Праважаты пасунуўся яшчэ бліжэй. Увесь яго выгляд вылучаў разняволенасць. Ад вымушанага палону дзяўчыну ахапіла трывога, нейкая калючая, сухая, нібыта асцюкі сена. Васіліна адшукала ў залатых днях дзяцінства той светлы летні час, калі дзед паслухаўся сваю пястушку і падняў да сябе, пад самы дах пуні. А вось яна ўжо ляціць з пакатага боку ўніз у дужыя родныя рукі. Сапраўдны пах лугавога сена — пах пылу, салодкай канюшыны і сонца заказытаў нос, а галоўнае — стаў паміж ёй і раптоўнай трывогай.

Калі падрасла, яна, вядома, вызваліла старога чалавека ад клопату завіхацца на верхатуры. Цяпер гэта яе, Васілініны, праца — прымаць і старанна трамбаваць назапашаныя ў гарачую пару вазы духмянага скарбу. Паступова сонечны водар сена пачаў аддаляцца і, нарэшце, саступіў месца пякучаму болю, такому ж рэальнаму, як раней — пах. Аж захацелася расцерці драпіны на скуры ад асцюкоў. Трывога вярталася, а разам з ёй і разуменне, што страчана ўжо і надзея перажыць яшчэ раз той незвычайны стан палёту, спазнаны ў дзяцінстве.

Ля ракі, у густым кустоўі заліваліся салаўі. А першы спявак, мусіць, самы смелы і галасісты, аблюбаваў маладзенькую яблыньку побач з альтанкай. Салоўка перашкаджаў размове, аглушаў спевам. Злосць кавалера на гарлапана-канкурэнта смяшыла Васіліну. Хлопец адчуваў гэта. І здзеклівая смяшлівасць дзяўчыны яшчэ больш распальвала яго адчуванне бездапаможнасці.

І калі ў чарговы раз свістун перабіў на паўслове, хлопец рэзка прыцягнуў дзяўчыну да грудзей і пачаў абсыпаць драпежнымі пацалункамі яе твар, валасы, шыю. Васіліна адпіхнула нахабніка і выскачыла з альтанкі.

— Адчапіся! Накінуўся, як каршун.

Такі паварот кавалер прыняў за асабістую прамашку. У вачах застыла нямое пытанне: «Што не так?» Звычайна ў гэтай справе ўсё ішло гладка, без асечак. Далікатнічаць не было патрэбы. Адмова Васіліны асфальтавым катком прайшлася па мужчынскаму «я». Гэта было па-за межамі яго разумення. «Звязаўся чорт з дзіцем!» — злосна вылаяўся пакрыўджаны дзяцюк. Не ўслых.

— Ты чаго, Васіліна?! Я ж з сур'ёзным намерам. Бацькам патэлефанаваў. Яны ўжо і рамонт задумалі. Ну, да нашага вяселля... ажаніцца я надумаў. Узрадаваліся вельмі бацькі, што менавіта цябе хачу ўзяць за жонку... Чакаюць ужо, калі маленькія Васілёчкі-кветачкі звонкім смехам дом напоўняць. Дык я падумаў, навошта падманваць бацькоўскія спадзяванні?

Хлопец стаяў у праёме альтанкі, упёршыся рукамі ў габляваныя дошкі. Голас яго па-здрадніцку дрыжаў і часам, на высокіх нотах, нагадваў Васіліне суседскага пеўня, які храбрыўся пасля няўдалай бойкі. І ёй стала шкада хлопца. Захацелася, як калісьці, пасля дзіцячай шкоды, прашаптаць: «Васілёк, Васілёчак, бедненькі...» Пагладзіць па кучаравай галаве. Але кучараў не было, галава была паголена пад нуль. Дзед, адзіны цырульнік на вёсцы, а таму і неблагі, называў гэтую моду «качаном». З чым яна была згодная.

Так і не адважыўшыся на пяшчоту, Васіліна зрабіла стаўку на заўсёднае дзявоцкае — падняць хлопца на смех.

— Звар'яцець можна! Дзівак-чалавек, ажаніцца надумаў, мяне толькі забыўся запытацца!.. І калі ты пры памяці — мой васямнаццаты дзень народзінаў толькі ў канцы лета.

У размове ўзнік вымушаны перапынак — крылаты спявак зноў на ўсе грудзі заліўся песняй кахання.

— Можна і ў сямнаццаць запісацца, даведку возьмем. Раней цябе не вельмі хваляваў узрост, як я памятаю. Ах-ха-ха...

Узрадаваны сваёй знаходлівасцю, хлопец закінуў галаву — смех сухім гарохам пасыпаўся з горла. Васіліна ўпершыню адчула агіду да найлепшага сябра дзяцінства. Яе шчокі заліла густая чырвань. «Сабе вазьмі даведку, вялікі стратэг! Знайшоў, што ўспамінаць: як з дзіцяці неразумнага пасмяяліся...»

Новая пералівістая песня на дванаццаць кален выратавала маладых людзей ад сваркі.

Пад багатую на свіст, шчоўканне і пералівы песню Васіліна нібыта пераглядае забытае дурное кіно. Пра тое, як яе, шасцігадовую, замуж не пусцілі. У кадры — высокая станістая маці сябра. Вакол галавы — чорная, да сіняга бляску, змейка касы. Чаму яна падціскае вусны пры размове? Хмм... А вось яна, Васіліна. У вачах — жах ад такога доўгага расстання, размазаныя па твары слёзы. Сябра са сціснутымі кулакамі патрабуе ў маці ўзяць Васілінку з сабой. Жанчына чамусьці робіцца неверагодна вялікай, яе голас гучыць аднекуль зверху: як возьмеш за жонку — калі ласка. Буйным планам — твары дзяцей, сябра злізвае слязінку з яе шчакі. Цёмны калідор. Верхні гузік ніяк не паддаецца, Васілёк туга перавязвае шалікам каўнер на паліто Васіліны. Змена дэкарацый. Падобна Майсею, хлопчык вядзе сваю сяброўку дахаты па вузкай сцежцы, злева і справа ўзвышаюцца высачэзныя сумёты. Зімовае сонца слепіць. У светлым пакоі — яе маці. Маладая жанчына адкладае цыроўку, з сур'ёзным выглядам адпраўляе дачку збіраць рэчы. А пасля, ужо на парозе, груба аклікае яе і абражае. Усё, кіно скончана.

Застаўся непрыемны прысмак моташнага чакання маці. Але гэта па-за кадрам. Як і дзівосны пах горада, які маці прывозіць на сваім адзенні і куды яе, Васіліну, чамусьці не бярэ.

Раптам салоўка сціх. Хлопец адразу скарыстаўся становішчам.

— Кветка-васілёчак, сталець трэба. Я цябе за жонку ўзяць хачу, разумееш? Усё па-даросламу! Ну, што ты ў гэтай вёсцы выседзіш?

Ад яго позірку не схаваліся перамены да лепшага ў настроі ўпартай асобы. Хлопец адчуў сябе пераможцам і да наступных слоў паставіўся як да дзявочых капрызаў.

— Усё так, вядома, але ж ці кахаю я цябе — запытацца забыўся.

— А ты чаму не пытаешся — ці я цябе кахаю?

— Бо мне ўсё роўна. Усё! Будзь здаровы!

Васіліна нырнула пад руку кавалера, і праз момант прарыпела засаўка ў сенцах.

— Э-эх, васілёчкі-кветачкі! Адзін пацалунак на развітанне, у шчочку, піянерскі, адзін! Васілінка, адчыні! — зашчабятаў салоўкай кавалер у шчыліну дзвярэй.

Уцякачка кінула на развітанне з'едлівае:

— Ідзі да Еўкі. Няхай яна цябе цалуе.

Хлопец ведаў сагнутую ў дугу бабку Еўку з тварам зморшчаным, бы яблык з гарышча вясной. Упартасць абранніцы толькі яшчэ больш распаліла маладую кроў.

Некалькі дзён дзяўчына пазбягала кампаніі наваяўленага жаніха. Тады Васіль пераняў бабулю ў краме і наўмысна на людзях папярэдзіў, каб чакалі сватоў. Па вёсцы пайшла пагалоска, зразумела, з прыкрасамі. Бабуля разы з два рабіла захады, каб высветліць сітуацыю, але ўнучка рашуча трымала абарону.

А ў пятніцу, на вялікую радасць Васіліны, прыехала стрыечная сястра Аксана. Як звычайна, сёстры шапталіся да раніцы ў першым пакоі. Васіліна цярпліва слухала аператыўныя зводкі з асабістага жыцця старэйшай сястры, выбачала маленькія нестыкоўкі ў сюжэце: яна чакала, калі можна будзе распавесці пра сваё, параіцца. Але, пачуўшы навіну, Аксана зазбіралася спаць.

Раніцай за сняданкам Васіліну чакала сямейная нарада. Яе здзівіў тон сястры, бо ёй і ў галаву не прыходзіла, што гісторыя з магчымым замужжам можа пакрыўдзіць Аксану.

— Як я бачу, Васіліса Цудоўная, сабралася вэлюм прымераць раней за старэйшую сястру? Давай, выкладай па сутнасці.

Бабуля маўчала, але па ўсім было відаць, што яна ў змове з сястрой. Увесь Васілінін гардэроб цалкам складаўся з Аксаніных падарункаў: старых сукенак і спадніц сястры, паліто, якія выйшлі з моды ў горадзе, зацыраваных джынсаў і капронавых шкарпэтак. Бабуля была ўдзячная старэйшай унучцы за тое, што нават на школьную форму не трэба траціцца, а тая карысталася гэтым.

— Выходзь ты першая, якое пытанне. Забірай жанішка сабе.

— Ха! Дык мяне ж ён не бярэ! Я з радасцю б у Латвію адбыла, хоць якое, але замежжа. Нашаму Васілёчку, мабыць, раўня абрыдла, на сялянак пацягнула.

Васіліна ўгаворвала сябе паверыць у тое, што сястра жартуе, хоць брыдка, нядобра, але жартуе. І гэты дзіўны націск на слове «нашаму»...

— І што ты сабе думаеш, дзеўка? — набірала разгон і бабуля. — Лёкса мне на вочы кінуў: надта ганарлівая ваша дзеўка. Хлопец добры, не хіханькі-хаханькі — пабрацца хоча. У Міколы з Тамарай трохпакаёвая кватэра. Казаў, быў у тым Венспілсе, дык мора канцакраю не відаць. Людзі з усяго свету едуць паглядзець...

Дзед, які звычайна не ўступаў у бабскія спрэчкі, маўклівы і нешматслоўны, нечакана для ўсіх стукнуў вялікім жалезным кубкам па стале. Малако цурком палілося з цыраты на падлогу.

— Многа ён бачыў, Лёкса гэны, асабліва калі вочы зальле! І там, у Тамары з Міколам, мора бачыў, ага. Сказаў бы я, што ён там бачыў... Э, пустыня... Што ж не застаўся ў дзяцей жыць, а назад праз месяц у пустую халодную хату бягом прыбег? Не хадзі, дзяўчына, калі не хочаш. Твая цяпер такая работа — жаніхоў перабіраць.

На гэтым сямейная нарада і скончылася. Языкатая баба пярэчыць свайму старому не стала. Ведалі, што нават згадка пра Латвію выводзіла гаспадара з раўнавагі. Адтуль у сорак пятым атрымалі пахаванку на яго брата Івана.

Але ж на суботнія танцы сёстры пайшлі разам. Завіталі, вядома, як патрабуе вясковы этыкет, а дзявятай. Моладзь танцавала ў шырокім крузе. Аксана смела выходзіла на сярэдзіну, выцягнуўшы з сабой першага хлопца, які трапіў пад руку. Той канфузіўся, няўмела ламаўся, не паспяваючы за зграбнымі рухамі Аксаны. Дзяўчына не саромелася, выходзіла некалькі разоў смаліць, а пасля знікла. Хлопцы кучкаваліся за клубам, падаграваючы настрой. Васіліне падалося, што і белая аголеная галава мільганула сярод нецвярозай кампаніі. Далей, паводле закону жанра, павінна адбыцца бойка. Адным словам, нічога новага, трэба ісці дахаты.

Ноч дыхала рачной вільгаццю. Салоўкі яшчэ дзе-нідзе шчабяталі сваім абранніцам песні кахання. Васіліна звярнула ў сваё гумно. Вось і абрыс альтанкі каля хаты, дзе яны з Васілём сядзелі, побач у святле месяца белы бэз... Але раптам яна пачула, а пасля і ўбачыла ў невысокім стажку тое, што павінна застацца толькі паміж двума. Патрывожаная парачка схамянулася. Пад знаёмы посвіст — «Васілёчкі-кветачкі...» — у месяцовым святле з'явілася кароткая стрыжка сястры.

Васіліна кінулася прэч. Яна бегла, пакуль не адчула птушыную лёгкасць, тую, дзіцячую, аб якой марыла. Згадала сваю даверлівасць і абсалютную перакананасць у тым, што родныя рукі абавязкова падхопяць. А як жа інакш!

## Извещение о проведении 1 июня 2023 года повторного аукциона № 02-У-23 с условиями на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий и сооружений)

| Номер предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Краткая информация о расположенных на земельных участках капитальных строениях (зданиях, сооружениях), подлежащих сносу | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | г. Минск, пересечение ул.Ваупшасова и ул. Солтыса | 1,5300 | Для строительства объекта «Объект торгово-бытового и коммунально-обслуживающего назначения на пересечении ул. Ваупшасова и ул. Солтыса в г. Минске» | 15 883,03 | 83 692,91 | 16 700,00 | Снос строений и сооружений, попадающих под пятно застройки, в том числе отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Таежной, 109, ул. Солтыса, 177, 179 | 1 061 855,70 |
| 2 | г. Минск ул. Виноградная | 0,2648 | Для строительства объекта «Объект торговли и бытового обслуживания по ул. Виноградной в г. Минске» | 22 253,15 | 11 123,26 | 2 224,00 | Снос объектов недвижимого имущества, попадающих под пятно застройки, в т. ч индивидуальных боксовых гаражей: ул. Сосновый Бор, 9А, пом. 12; ул. Сосновый Бор, 25А; ул. Сосновый Бор, 27; ул. Сосновый Бор, 27/1; ул. Сосновый Бор, 27/3; ул. Сосновый Бор, 27/4; ул. Сосновый Бор, 27/6; ул. Сосновый Бор, 27/8; ул. Сосновый Бор, 27/9; ул. Сосновый Бор, 27, пом. 10; ул. Сосновый Бор, 27/11; ул. Сосновый Бор, 27/12; ул. Сосновый Бор, 27/14; ул. Сосновый Бор, 27/15; ул. Сосновый Бор, 27/16 | 389 532,51 |
| 3 | г. Минск в районе Степянка | 1,2200 | Для строительства объекта «Административно-деловой центр с многоуровневой гараж-стоянкой на 300 машино-мест в районе Степянка в г. Минске» | 13 667,96 | 66 335,97 | 13 267,00 | Снос объектов недвижимого имущества, попадающих под пятно застройки, в т. ч.: строения, здания и сооружения по ул. Карвата, 87, корп. 10, а также других объектов (ограждения, ворота, многолетние насаждения). | 236 103,86 |

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10.

Вид аукциона: открытый (на повышение начальной цены). Предмет аукциона: право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемых земельных участках, на которых находятся объекты, подлежащие сносу.

На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет.

Аукцион состоится **1 июня 2023 г. в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7.

